№ 36 (586) 2 кастрычніка 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Аднэўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## Забытая сталіца

Рэпартаж Сяргея Харэўскага з Чарэі Мілашаў і Сапегаў.

Старонка 12

# «Нас кінулі»

«Гэта кідалава, падман народу. Галасы лічылі 15—20 хвілін. Адбылося тое, што аб нас выцерлі ногі. Я хачу зклікаць: паважаныя грамадзяне, не хадзіце больш на выбары! Толькі на Плошчах можна нешта вырашаць. Калі Эўрасаюз прызнае гэтыя выбары, то я больш ня буду паціскаць руку эўрапейскім палітыкам. Нас кінулі», — даслоўна так каля поўначы 28 верасьня сказаў праз тэлефон у інтэрвію «НН» прадпрымальнік Віктар Гарбачоў, кандыдат па Барысаўскай гарадзкой акрузе.

Здаецца, што эмацыйныя словы Гарбачова ў ноч пасьля галасаваньня досыць яскрава ілюструюць стан часткі апазыцыі пасьля выбараў. Наіўна спадзяваліся на адно (напэўна, нехта ўжо бачыў сябе ў снах дэпутатам палаты) — атрымалі ж зусім іншае.

У панядзелак з раніцы лідэры АДС давалі выніковую выбарчую прэс-канфэрэнцыю. Твары лідэраў зусім не зіхцелі ад шчасьця. «Гэта чарговая «элегантная перамога» ўлады, а падчас «элегантных перамог», як вядома, галасы ня лічаць», — сказаў Анатоль Лябедзька.

«Разам з тым, мы не павінны гадаць, чаму некаторыя нашы калегі прайшлі ў парлямэнт, мы не павінны гадаць, што думае ўлада, цяпер зноў сытуацыя чорна-белая. Лукашэнка кінуў эўрапейцаў, гэта параза эўрапейскай дыпляматыі, тых людзей, якія ўжо разьлічвалі прыйсьці сюды з сваім бізнэсам. Магчыма, улада проста атрымала сыгнал з Масквы, што прысутнасьць апазыцыі ў парлямэнце непажаданая», — лічыць А.Лябедзька.

**Працяг на старонцы 3.**

## У НУМАРЫ

**Вачыма загнаных**
Апазыцыя павінна падзякаваць уладам за датэрміновае галасаваньне. Піша Барыс Тумар. **Старонка 2.**

**І ўсё-такі ён гадронны**
Як па-наску называць калайдэр. **Старонка 2.**

**Рэдэле як рэдэле, абы добры мэндэле**
Аляксандар Астравух прэзэнтаваў вялікі ідыш-беларускі слоўнік. **Старонка 9.**

**Пад бел-чырвона-белым парасонам**
Успамін пра Шамякіна. Піша Ўладзімер Содаль. **Старонка 10.**

**Алесь Камоцкі**
8 кастрычніка ў «Казе». Афіша. **Старонка 15.**

**Ад чаго заікаюцца білінгвы**
Дзьвюхмоўе можа быць адной з прычынаў, якія правакуюць заіканьне. Затое білінгвы маюць лепшыя матэматычныя і аналітычныя здольнасьці. **Старонка 14.**

**Прэзэнтацыя Станкевіча ў Горадні**

4 кастрычніка ў капліцы рыма–каталіцкай парафіі Аўгустовак (вул. Рэпіна) у 19.30 адбудзецца прэзэнтацыя віртуальнай энцыклапэдыі «Нашы Касьцёлы» і збору твораў а. Адама Станкевіча «З Богам да Беларусі». Прыедуць філёзаф Валер Булгакаў і гісторык Алесь Пашкевіч.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Новыя куміры

БАТЭ праэкзамэнаваў «Старую сіньёру». Старонка 2.

**На фота: галоўны трэнер БАТЭ Віктар Ганчарэнка.**

# Для Мінкульту «Тутэйшыя» — шавінізм

Упраўленьне рэгістрацыі і клясыфікацыі кіна- і відэапрадукцыі пры Міністэрстве культуры адмовіла ў рэгістрацыі тэлеспэктаклю «Тутэйшыя», зьнятага на замову тэлеканалу «Белсат».

Адною з падставаў для адмовы стала нізкая якасьць гуку: «Кроме того, в данном фильме искажается смысл и художественная направленность произведения народного поэта Беларуси Я.Купалы… В финальной части фильма имеет место проявление шовинизма и национальной исключительности, что недопустимо», — піша В.А.-Курловіч, начальнік Упраўленьня рэгістрацыі і клясыфікацыі кінавідэапрадукцыі Дэпартамэнту кінэматаграфіі.

На думку тэлеканалу «Белсат», прычыны нерэгістрацыі глыбейшыя. Рэжысёры Валер Мазынскі і Дарыюш Шада-Бажашкоўскі нагадваюць, што вялікай папулярнасьцю карыстаўся спэктакль «Тутэйшыя» ў пастаноўцы Пінігіна, але і яго зьнялі з рэпэртуару Купалаўскага тэатру. А сама п’еса была пад забаронай увесь савецкі час.

Тэлеспэктакль «Тутэйшыя», зьняты Мазынскім і Бажашкоўскім, амаль дакладна ідзе за арыгінальным тэкстам Купалавай трагікамэдыі.

Дзяржаўная рэгістрацыя дазваляе распаўсюджваць кінапрадукцыю, арганізоўваць паказы.

Гэта ня першы незалежны фільм на беларускай мове, які забараняецца да паказу ў Беларусі. Раней той жа лёс напаткаў «Акупацыю» Андрэя Кудзіненкі, што не зашкодзіла фільму ўзяць прэстыжныя міжнародныя ўзнагароды.

Беларусь застаецца апошняй краінай Эўропы, дзе захоўваецца палітычная цэнзура ў сфэры культуры.

**МБ**

# А дзе ў вас іншы Глобус?

Адаму Глобусу — 50. Ён нарадзіўся 29 верасьня 1958 году ў Койданаве ў сям’і пісьменьніка Вячаслава Адамчыка.

Глобус, які ўжо самым неэтнаграфічным псэўданімам узбурыў традыцыю, быў сузаснавальнікам рэвалюцыйнай літаратурнай суполкі «Тутэйшыя».

Ён аўтар кнігі ўрбаністычнай паэзіі «Парк», зборнікаў прозы «Адзінота на стадыёне», «Сьмерць — мужчына», «Дамавікамэрон», «Толькі не гавары маёй маме», «Койданава», «Post scriptum», «Браслаўская стыгмата», «сУчасьнікі».

У год юбілею Адам Глобус нібы вярнуўся на 25 гадоў назад і зноў пачаў маляваць — палотны, поўныя тонкага перажываньня часу.

Яшчэ маладым ён стаў каардынатнай пастацыю нон-канфармісцкага культурнага кола.

Паліфанічнае інтэрвію — **старонка 8**.

# Вачыма загнаных

Апазыцыя павінна дзякаваць уладам за датэрміновае галасаваньне. Піша **Барыс Тумар**.

Сацыёлягі адсочваюць цікавы парадокс: колькасьць людзей, якія лічаць, што выбары ў Беларусі фальсыфікуюцца, намнога, амаль удвая, большая, чым колькасьць тых, якія катэгарычна адмоўна ставяцца да лукашэнкаўцаў, падтрымліваюць апазыцыю штодзень ці галасуюць за кандыдатаў ад нацыянальна-эўрапейскіх сілаў. Гэта значыць, што многія галасуюць за лукашэнкаўцаў і ўсё адно перакананыя ў фальшывасьці рытуалу з камісіямі, роўнымі ўмовамі ў выглядзе плякатаў, назіральнікамі ад БРСМ, экзыт-поламі ад КГБ і жрыцай багіні непадкупнасьці гадоўлі Калінінградзкага юрфаку на чале не дае чаканага эфэкту.

Ці ў тым заслуга свабодных СМІ? Сумняюся, бо яны даступныя ўсяго пары працэнтаў грамадзянаў. Улёткі і незарэгістраваныя выданьні таксама даходзяць толькі да невялікай групы. Сама сыстэма, безь ніякае на тое падказкі збоку, падаецца людзям ашуканскай.

Працяг на старонцы 6.

# Пабачыць Дэль П'ера — і захапіцца Крыўцом

У аўторак перад футболам жартаваў, што жыцьцё будзе пражытае не дарма, калі пабачу самога Дэль П'ера, колішняга куміра дзяцінства. Пабачыў. А захапілі зусім іншыя гульцы, свае. Піша **Зьміцер Панкавец**.




**Першыя беларускія галы ў фінальнай стадыі Лігі чэмпіёнаў.**

Алесандра Дэль П'ера быў кумірам яшчэ ў тыя дзіцячыя гады, калі мы ганялі футбольны мяч на вясковым выгане. Тады з заміраньнем сэрца мы сачылі за Лігай чэмпіёнаў і спаборніцтвамі за першынство сьвету і Эўропы. Вялі сшыткі, дзе пазначалі вынікі гульняў, зьбіралі налепкі з вывамі найлепшых гульцоў сьвету, хацелі быць падобнымі да іх.

Нашымі кумірамі былі Клінсман, Кёпке, Замэр, Шырэр, Шэрынгем, Вэрон, Батыстута, Клюйвэрт, Зэедорф, Раванэлі, Віялі, Мальдзіні, Баджа, Рамарыё, Дунга, Стоічкаў, браты Лаўдрупы, Шмэйхель, Зыдан, Джаркаеф, Бартэз, Фігу і, натуральна, Дэль П'ера.

Гэты невысокі італьянец ужо ня проста адзін з многіх, ён увасабленьне эпохі.

Дэль П'ера выйграваў Лігу чэмпіёнаў, два гады назад у складзе «Скуадры адзуры» стаў чэмпіёнам сьвету. Ён забіваў дзясяткі галоў розным камандам. Дэль П'ера праз усю кар'еру застаўся верным «Ювэнтусу», нават калі каманду саслалі за карупцыйны скандал у Сэрыю В. Майкі зь ягоным прозьвішчам насілі і носяць ва ўсім сьвеце, у тым ліку ў Беларусі.

Нават у дзяцінстве мы, напэўна, ня верылі, што беларускі клюб некалі зможа выйсьці ў групавы этап Лігі чэмпіёнаў, прывесьці ў краіну такія каманды, як «Рэал» і «Ювэнтус». Гэта выглядала абсалютна нерэальна, а ўсе словы Анатоля Капскага ўспрымаліся зь вялізнай доляй скептыцызму.

Таму гульня на «Дынама» 30 верасьня — гэта як дакрануцца да казкі, спраўдзіць сваю колішнюю мару. Ня важна ўжо, зь якім лікам сыграюць клюбы, важны сам факт прысутнасьці на гэтым сьвяце футболу. Прызнацца, калі перад пачаткам гульні загучаў гімн Лігі чэмпіёнаў, па целе прабегліся дрыжыкі.

Дзякуючы БАТЭ, у краіне пачаўся футбольны бум.

Людзі з ночы займалі чэргі ля касаў стадыёну, каб дабыць запаветны квіток на гульню. На стадыёне фактычна не было вольных месцаў, і падтрымка была належная. Зрэшты, ні для кога не сакрэт, што людзі ішлі на футбол перажываць за БАТЭ, але глядзець на «Ювэнтус».

Як жа нечакана было, што ўжо зь першых хвілін барысаўцы пачалі дзейнічаць першым нумарам. Не адбівацца ад атак апэнінцаў, а шукаць шчасьце ля чужых варот. Спачатку Радзівонаў ня змог скарыстаць выхад адзін на адзін з брамнікам, але ўжо праз нейкі дзесятак хвілін Сяргей Крывец пасьля бліскучай перадачы Дзьмітрыя Ліхтаровіча абыграў Манінгера і накіраваў мяч у пустыя вароты. Стадыён шалеў. Першы беларускі гол у Лізе чэмпіёнаў!

Працяг на старонцы 7.

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ



### Пілігрымка да Вострай Брамы

**З 14 па 16 лістапада адбудзецца пілігрымка да Вострай Брамы (Вільня)**, якую арганізоўвае Віцебская каталіцкая дыяцэзія. Малітоўнае падарожжа прымеркавана да ўдзелу ва ўрачыстых набажэнствах у сьвята Маці Божай Вострабрамскай **16 лістапада**.

Цана паездкі — 120 эўра (пражываньне ў гатэлі Victoria*** ў цэнтры Вільні, сьняданак, вячэра, для сямейных параў — двухмясцовыя нумары).

**Праграма пілігрымкі:**

**14 лістапада**

Выезд зь Беларусі.

Прыезд у Вільню, засяленьне ў гатэль.

Сьвятая Імша (Вострая Брама).

Вячэрняя прагулка.

**15 лістапада**

Экскурсія ў Трокі (Тракайскі замак).

Знаёмства зь Вільняй.

Наведванне супэрмаркету, вольны час.

**16 лістапада**

Сьвятая Імша.

Знаёмства зь Вільняй (гара Трох крыжоў, вежа Гедыміна і інш.).

Вяртаньне ў Беларусь.

**Арганізатар: каардынатар пілігрымак у Віцебскай дыяцэзіі,** пробашч парафіі Сьв. Язафата Кунцэвіча ў Расонах кс. Вячаслаў Барок.

**Тэл.: (029) 518-72-27 (МТС)**
**(029) 618-72-99 (Velcom)**
**(02159) 4-26-25**
**e-mail: piligrymrym@tut.by; baroks@tut.by**

## ВОДГУК

# І ўсё-такі ён гадронны

Слова «гадрон» паходзіць з грэцкага «ἁδρός», — «моцны». Рысачка над «ἁ» ў грэцкай мове абазначае прыдыханьне, і ў лацінскай мове гэтае прыдыханьне перадаецца ўжо паўнацэннай літарай h: «hadros». Лаціна ж ёсьць галоўным пастаўшчыком грэцызмаў у эўрапейскія лацінічныя мовы. Таму й ня дзіва, што нашумелы Вялікі калайдэр вядомы як «гадронны» ня толькі немцам і ангельцам, але й заходнім ды паўднёвым славянам, што карыстаюцца лацінскай графікай.

Бяз «г» пішуць калайдэр баўгары і расейцы. Што да пазычаньняў у беларускай ды ўкраінскай мовах, дык іх шлях дасёньня няпросты ды пакручасты, бо ляжыць праз мову расейскую. Традыцыйна, інэрцыйна ды бязь лішніх разваг бярэцца ўжо асвоенае расейшчынай ды гатовае да ўжываньня іншамоўнае слова. Гэта зручна, але пакідае галоўнае пытаньне — чаму? — без адказу. Пытаюцца пра гэта ў сваіх моваазнаўцаў і ўкраінцы, запыталіся і ў нас нашыя чытачы.

Таму што так напісана ў слоўніку, адказваюць прынятыя гэтым летам афіцыйныя Правілы артаграфіі і пунктуацыі, няпроста ж бо патлумачыць, чаму грэцкая «historía» з такой самай прыдыхальнай рысачкай над «ἁ» дала беларускую «гісторыю», а з грэцкага «hadros» выйшаў «адрон».

У кнізе «Беларускі клясычны правапіс» перадача такіх пазычаньняў разглядаецца ў 20-м разьдзеле, і калі ведаць, што адкуль запазычана (а мы ведаем), адказ адназначны — «г» пішацца абавязкова.

Такім чынам, у Вялікім калайдэры пад Жэнэвай разганяюць гадроны, таму й калайдэр правільна называць гадронным.

Дапамагаў разабрацца ў асаблівасьцях іншамоўных пазычаньняў адзін з аўтараў «Беларускага клясычнага правапісу» — Зьміцер Саўка.

**Андрэй Кузьнечык**

## З КАМЭНТАРОЎ НА NN.BY

### Піша Вінцук Вячорка:

Дыскусіі пра гадроны няма. Адназначна: гадрон.

А сам ён усё-такі калідэр. Навошта лацінізму, аднакаранёваму з словам калізія, няпросты ды пакручасты шлях, які ляжыць праз мову ангельскую? Заадно спрэчкі «калайдэр» ці «каляйдэр» унікнем.

Па-баўгарску — големият хадронов колидер.

Македонцы тлумачаць сваім дылетантам, што «Ларѓ Хадрон Колидер» е 27 километри кружен протонски акцелератор.

Сэрбы: Велики хадронски колидер.

Літоўцы выбіраюць: didțiřjř/stambiřjř dalëliř/ hadronř greitintuvas/dauțytuvas/kolideris/ sumuđtuvas. Паважаю сапраўдных пурыстаў і запрашаю чытачоў іх перасягнуць.

Палякі: wielki kolider hadronów/hadronowy; чэхі: velký hadronový kolider.

Немцы: Hadron-Kollider.

Гальскія нашчадкі рымлянаў мусілі выштукаваць сваё: le grand collisionneur de hadrons.

Таму — калідэр.

## СЬЦІСЛА

### Цэны на нафту ўпалі на 9%, а пасьля зноў падняліся

У панядзелак на нью-ёркскай біржы NYMEX цана нафты REBCO зьнізілася на 9,59 % і склала 90,72 даляра за барэль. Падзеньне цэнаў адбылося на фоне адхіленьня Кангрэсам ЗША пакету мераў па стабілізацыі фінансавых рынкаў аб'ёмам 700 млрд даляраў. Як толькі ў аўторак прыйшлі навіны пра шанцы на перагаласаваньне пакету, цэны вярнуліся на ранейшы ўзровень.

### Расея надбаўляе вайскоўцам

1,5—8 тыс. даляраў на месяц. Вайскоўцы, што дабіліся высокіх паказчыкаў у службе, будуць атрымліваць з 1 студзеня штомесячную дабаўку да заробку ад 35 тыс. да 160 тыс. расейскіх рублёў. Пра гэта паведаміў прэзыдэнт Расеі Дзьмітрый Мядзьведзеў. Сума ўзнагароджаньня будзе залежыць ад займанай пасады.

### Аўстраліец даў грошы

на рэстаўрацыю гарадзенскай сынагогі. Продкі Аві Сыльвэра паходзяць з Горадні. Дзякуючы яго дапамозе правядуць дасьледаваньне і рамонт фрагмэнтаў фасаду Вялікай харальнай сынагогі. На гэтыя мэты пойдзе ўсяго 1,2 млн даляраў. Вялікая сынагога была збудаваная ў XVI ст.

**СМ, МБ**

# Усё схоплена

Ніводнага кандыдата ад апазыцыі не прапусьцілі ў дэпутаты на выбарах, якія, паводле ацэнкі Місіі назіральнікаў АБСЭ, «не адпавядалі дэмакратычным стандартам».

Наіўныя спадзяваліся, што ў выніку выбараў 28 верасьня у парлямэнт трапяць некалькі прадстаўнікоў апазыцыі. Такія спадзяваньні расьлі на фоне перамоваў беларускіх чыноўнікаў з заходнімі дыпляматамі і палітыкамі. Віравала мноства чутак наконт магчымых прызначэнцаў ад апазыцыі, называліся нават канкрэтныя прозьвішчы. На справе ж ніхто з прадстаўнікоў апазыцыі ў парлямэнт ня трапіў.

Паводле старшыні ЦВК Лідзіі Ярмошынай, у выбарах узялі ўдзел 75,3%. Новая планка была ўзятая на датэрміновым галасаваньні, у якім узялі ўдзел ажно 26% выбарцаў. Напрыклад, у Жлобіне на БМЗ людзей прасілі галасаваць датэрмінова, у адваротным выпадку пагражалі нэгатыўнымі наступствамі для іх непасрэднага начальства. У вёсках людзям абяцалі заплаціць заробкі і авансы, калі яны возьмуць удзел у выбарах раней за 28 верасьня (гл. лісты ў Рэдакцыю, **старонка 10**). У інтэрнатах БНТУ яўка датэрміновага галасаваньня склала амаль 100%.

Ва ўсіх 110 акругах выбары адбыліся ў першым туры. Прычым фактычна паўсюль пераможца атрымаў прыкладна 70% галасоў. Прадстаўнікам апазыцыі, паводле пратаколаў, дасталося ад 5 да 30%: у правінцыі шчадрэй, у Менску ж ніхто з дэмакратычных кандыдатаў не заслужыў больш за 16%.

Найбольшы вынік па краіне з прадстаўнікоў сьпісу АДС запісалі ў Гродні эканамісту Яраславу Раманчуку (АГП) і ў Слоніме доктару Івану Шэгу (БНФ) — больш за 30%. Прычым на адзіным участку ў горадзе, дзе ў камісію змог патрапіць прадстаўнік Івана Шэгі, апазыцыянэр атрымаў перамогу.

Аналягічная сытуацыя зафіксаваная ў Горках, дзе балятаваўся вылучэнец Партыі БНФ Андрэй Юркоў. Кандыдат перамог на трох участках, дзе ў камісіях было па адным ягоным чалавеку. Нават у вёсцы Аўсянка — на малой радзіме кандыдаткі-лукашэнкаўкі, дзе яе аднадушна вылучаў у кандыдаты працоўны калектыў! Таксама ў Міхееўцы і Даманах. Агулам Андрэю запісалі 18,1% галасоў.

Увогуле амаль усюды, дзе ў акруговых камісіях былі прыхільнікі апазыцыі, удалося зафіксаваць парушэньні. Ці ня самае яркае зь іх мела здарыцца ў Шклове.

Сябру мясцовай акруговай выбарчай камісіі Пятру Мігурскаму ўдалося перахапіць два пустыя пратаколы, падпісаныя сябрамі ўчастковых камісій. Гэтыя паперы паступілі ў Шклоў зь вёсак Александрыя (радзіма Лукашэнкі) і Бушлякі.

Мігурскі забраў іх, і гэта дае падставу кандыдату ад Партыі БНФ Рыгору Кастусёву патрабаваць правядзеньня новых выбараў. ЦВК ж пасьпяхова абвясьціў пераможцам старшыню шклоўскага райвыканкаму Валер'я Іванова.

Яшчэ адзін цікавы выпадак быў зафіксаваны на Старавіленскай сталічнай акрузе, дзе правапарушэньні выявіў міліцыянт (!). У суботу падпалкоўнік крымінальнага вышуку Казлоў падчас абедзеннага перапынку зафіксаваў ускрыцьцё скрынкі і ўкідваньне туды бюлетэняў. Як паведамлялі праваабаронцы, падпалкоўнік быў выкліканы ў РУУС Цэнтральнага раёну сталіцы, дзе ад яго патрабавалі адмовіцца ад намераў скардзіцца. Пасьля таго, як Казлоў адмовіўся, пратакол было вырашана скласьці ўжо на яго за «перашкоды ў працы камісіі».

Мандаты дасталіся нават ня ўсім сёньняшнім дэпутатам палаты. У сьпіс ня трапілі Віктар Кучынскі і Вольга Абрамава, якія ў ранейшым сходзе выконвалі ролю апазыцыі.

На жаль, у часе выбараў так і не былі арганізаваныя незалежныя экзыт-полы. Бязь іх цяжка даваць ацэнкі, але складалася ўражаньне, што апазыцыі ўдаецца захоўваць салідную электаральную базу, хоць большасьці яна дасягае толькі ў асобных гарадах і раёнах. Адна захаваньня базы замала для пераменаў.

**Зьміцер Панкавец**




**Вось і ўсё, што бачылі назіральнікі на большасьці акругаў. Фота зь відэа, зробленага схаванай камэрай. Назіральнікі зь місіі АБСЭ заявілі, што падлік галасоў быў непрымальны на 48% участкаў.**

## «Нас кінулі»

**Працяг са старонкі 1.**

«Улада прайграла палітычна і маральна, — кажа лідэр ПКБ Сяргей Калякін. — Мы таксама прайгралі. Наўрад найбліжэйшым часам сытуацыя ў Беларусі будзе мяняцца. У эўрапейцаў цяпер вельмі вялікае расчараваньне, бо яны ўпершыню сутыкнуліся з такім кідалавам».

Толькі Ігар Рынкевіч з БСДП прызнаў, што ўдзел у выбарах быў памылковым. «Калі б дэмакратычных кандыдатаў не было ў выбарчых сьпісах, то яўка па Менску відавочна магла быць меншая за 50%. Пры добрай першапачатковай працы ідэя байкоту выбараў магла б насамрэч спрацаваць», — кажа Рынкевіч. Палітык не выключае магчымасьці байкоту наступных прэзыдэнцкіх выбараў.

Лідэры АДС заклікалі міжнародную супольнасьць не прызнаваць легітымнасьці выбараў.

Крыху іншае меркаваньне мае лідэр «Руху «За Свабоду» Аляксандар Мілінкевіч. «Трэба найперш думаць, што патрэбна беларускаму народу, а не апазыцыі ці ўладзе, як бы пафасна гэта не гучала. Важна, каб акно ў Эўропу для нашых людзей не было зачыненым. Тут павінны супадаць інтарэсы ўлады і апазыцыі. Асабіста мне ня сорамна, што на дадзеным этапе нашыя інтарэсы супадаюць», — заявіў А.Мілінкевіч.

**ЗП**

## «Маўчаць! Не ўставаць! Не варушыцца!»

Сьвятлана Вяргейчык — жанчына сярэдняга веку, ахайна апранутая, з пэдантычным складам розуму. Яна раскладае на стале сьведчаньні таго, што, зь яе словаў, зьяўляецца відавочнай маніпуляцыяй галасамі выбарцаў на сталічных участках 484 і 485 Старавіленскай выбарчай акругі – той самай, дзе балятаваўся Анатоль Лябедзька. Гэта пратаколы з афіцыйнымі лічбамі галасаваньня. Па падліках назіральніцы, яны завышаныя амаль у два разы.

Спадарыня Вяргейчык назірала за выбарамі на 484-м участку ў Менску (там яна была афіцыйна зарэгістраваная), а таксама на ўчастку 485, галасаваньне на якім адбывалася ў тым самым пакоі. Сваё дзяжурства жанчына распачала ажно 23 верасьня, і практычна не сыходзіла з участку ўвесь час, калі былі адчыненыя ягоныя дзьверы — да вечару 28 верасьня. Той, хто калісьці быў назіральнікам на выбарах, ведае гэтую сыстэму: прыходзіць чалавек галасаваць, бярэ бюлетэнь, апускае яго ў урну — і назіральнік ставіць сабе ў нататнік рысачку. 23 верасьня спадарыня Вяргейчык «назьбірала» 12 рысачак, на наступны дзень крыху болей — 21 рысачку, 25 верасьня прыйшло 28 чалавек, 26 прагаласавала 35 чалавек, а ў суботу, 27-га, бюлетэні апускаліся ў урну 40 разоў. «Наколькі я магла чуць, такія самыя лічбы пэўтам паведамляліся сябрамі камісіі яе старшыні, — сьцьвярджае назіральніца. — Я даю вам чэсныя, канкрэтныя лічбы, я не адыходзячы сядзела, у прысутнасьці міліцыі, і ўсе мяне маглі бачыць. Я хадзіла на назіраньне як на працу. Прапусьціць магла ну хіба што аднаго-двух чалавек. Хаця вялікага наплыву не было, і людзей лічыць было нескладана. У асноўным ішлі людзі, старэйшыя за пяцьдзесят. З моладзі прыйшло на абодва ўчасткі 10 чалавек за гэтыя пяць дзён».

**Працяг на старонцы 4.**



**Відэазапіс сьведчаньняў Сьвятланы Вяргейчык можна пабачыць на nn.by**

## СЬЦІСЛА

### Цуды ў скрынках у Горках...

Дзівосы зафіксаваныя ў Горацкай акрузе, дзе ў дэпутаты ішла ня толькі цяперашняя «народная абраньніца», але і незалежны кандыдат Андрэй Юркоў. Андрэй карыстаецца павагай людзей, якія добра ведаюць яшчэ ягонага бацьку — у свой час паважанага дырэктара дрыбінскага саўгасу. Бацька быў арганізатарам Народнага Фронту калісьці, цяпер ягоную справу працягвае сын.

А цуд у іншым: на ўсіх участках, дзе былі незалежныя сябры камісій, кандыдат ад АДС Юркоў перамог. А дзе не было — «народ не аказаў яму даверу», як выражаецца Лідзія Ярмошына.

Людзі Юркова былі ўключаныя ў камісіі на трох участках. Самы цымус у тым, што перамогу кандыдата ад апазыцыі зафіксавалі ў вёсцы Аўсянка (на малой радзіме кандыдаткі-лукашэнкаўкі, дзе яе аднадушна вылучаў у кандыдаты працоўны калектыў!) Міхееўка і Даманы.

Агулам жа Андрэю пратаколы даюць 18,1% галасоў.

### ...і Слоніме

Паважанаму ў сваім горадзе доктару Івану Шэгу (БНФ) пратаколы даюць больш за 30% галасоў. Затое на адзіным участку ў горадзе, дзе ў камісію змог патрапіць прадстаўнік Шэгі, апазыцыянэр атрымаў перамогу.

### У вясковых акругах таксама галасавалі супраць лукашэнкаўцаў

Гэта асабліва выяўна там, дзе апазыцыі ўдалося дабіцца разьдзельнага падліку галасоў з датэрміновых выбараў і асноўнага дня галасаваньня. Гэтак, на выбарчым участку №7 Баранавіцкае вясковае акругі №7 у скрынцы для датэрміновага галасаваньня аказалася 37 бюлетэняў (2,26%) за кандыдата ад АГП Рыгора Грыка, тады як за дэпутата і сябра КПБ Уладзімера Майсюка — быццам бы 607.

А вось у скрынцы з дня галасаваньня лічбы істотна розьніліся: за Рыгора Грыка тут было 320 галасоў, або 35,8%, а за Майсюка — 426 галасоў, ці 47,65%, паведамляе ініцыятыва «Праваабаронцы за свабодныя выбары».

**МБ; АА, Магілёў**

# На Плошчы горача не было

Каля тысячы чалавек сабралася ў нядзелю на Кастрычніцкай плошчы, каб патрабаваць правядзеньня новых выбараў.

Калі лідэры АДС ладзілі прэс-канфэрэнцыю на прыступках Палацу прафсаюзаў, моладзь накіравалася на плошчу Незалежнасьці, да ЦВК.

Шматлікасьці не чакалася: многія актывісты апазыцыі ў гэты самы час знаходзіліся на выбарчых участках, дзе назіралі за падлікам галасоў.

На Плошчы сабраліся сябры незарэгістраваных арганізацый «Малады фронт» і «Джынс за свабоду». Узьняліся сьцягі, зьявіліся расьцяжкі. Міліцыя абсалютна ніяк не рэагавала — міжнародныя назіральнікі вакол!

Былі амаль усе палітычныя лідэры апазыцыі. Іх разрывалі на часткі замежныя карэспандэнты — у Беларусь іх зьехалася некалькі соцень. Віктар Івашкевіч на гэты раз быў не з традыцыйнымі бел-чырвона-белым і эўрасаюзаўскім сьцягамі, а толькі зь беларускім. Ён гэта растлумачыў сваім скепсісам да пазыцыі Эўропы.

Артур Фінькевіч разам зь Цімохам Дранчуком і Зьмітром Касьяровічам скарысталі акцыю, каб прэзэнтаваць новы рух «Моладзь за Беларусь». Іхных аранжавых сьцягоў на Кастрычніцкай было шмат. Менавіта ім належыць ідэя сымбалічнага ўсталяваньня на Плошчы двух намётаў.

Калі лідэры АДС ладзілі прэс-канфэрэнцыю на прыступках Палацу прафсаюзаў, моладзь накіравалася на плошчу Незалежнасьці, да ЦВК.

На скрыжаваньні праспэкту Незалежнасьці і вуліцы Энгельса моладзь, што несла наперадзе калёны расьцяжку «Мы за выбары, але супраць фарсу», выйшла на праезную частку, заняўшы палову дарогі. Тое самае было 10 студзеня падчас мітынгу прадпрымальнікаў. Тая акцыя скончылася «працэсам чатырнаццаці». На гэты раз міліцыя зноў заяўляе пра грубыя парушэньні грамадзкага парадку і абяцае найбліжэйшым часам накіраваць матэрыялы справы ў пракуратуру.

Каля дзесяці хвілін натоўп прастаяў насупраць будынку КДБ, гукаючы «Ганьба!». У адрозьненьне ад 2004 году, ніхто з камітэту мітынгоўцаў на чай не запрасіў.

На плошчы Незалежнасьці з дынамікаў гучала поп-музыка. «Для яе штаны малыя, і спадніца вузкая», — падпявалі ўдзельнікі мітынгу.

Нехта нават залез са сьцягам на помнік Леніна.

Выступалі Яўген Афнагель, Зьміцер Бародка, Франак Вячорка. Лідэр «Эўрапейскай кааліцыі» Мікола Статкевіч заявіў, што «мы сёньня пераканаліся, што нікога ня пусьцяць у парлямэнт». «Уладу ў Лукашэнкі можна выбіць разам з зубамі, і мы павінны гэта зрабіць», — грымеў палітык.

Пасьля моладзь рушыла назад на Кастрычніцкую акурат тады, калі на экране Ярмошына абвяшчала папярэднія вынікі яўкі. Людзі зноў пачалі гукаць «Ганьба!».

**Зьміцер Панкавец**

Асаблівасьцю гэтага шэсьця сталі запаленыя фаеры. Раней такога не бывала.



АНДРЭЙ КАЛЯДА

## «Маўчаць! Не ўставаць! Не варушыцца!»

Працяг са старонкі 3.

У дзень галасаваньня назіральніца вялікай актыўнасьці выбарцаў таксама не заўважыла. «Такім чынам, калі падсумаваць лічбы тых, хто прагаласаваў датэрмінова, на даму, і непасрэдна ў дзень галасаваньня, па маіх падліках атрымліваецца 658 чалавек», — абагульняе спадарыня Вяргейчык.

Цікава, што старшыня камісіі Ўладзімер Цароў катэгарычна адмовіўся паведаміць назіральніцы, колькі выбарцаў зарэгістравана на ўчастку, і колькі было прывезена бюлетэняў: «Тэлефануйце ў Цэнтравыбаркам». «Па-мойму, яны не зьяўляюцца сакрэтнымі», — абураецца назіральніца.

Пачаўся падлік галасоў. «Спадар Цароў нас адсунуў далёка-далёка, загадваючы, як вайсковец. Маўчаць! Не ўставаць! Не варушыцца! — распавядае жанчына. — Выбарчая камісія з двух бакоў акружыла стол. Я была ўпэўненая, што там толькі 136 бюлетэняў, ну, хіба што, на пару чалавек магла памыліцца. Але калі вывацілі тую урну датэрміновага галасаваньня, яна была заваленая ў поўным сэнсе слова. Папера, напэўна, распачкавалася, размножылася… Гэта неймаверна! Для мяне гэта было шокам. Калі яны бачылі, што чалавек сядзіць, увесь час назірае… Лічба, агучаная камісіяй, уражвала — паводле афіцыйных зьвестках прагаласавала 1163 чалавекі. «Гэта ж амаль у два разы больш, чым магло быць на самай справе!», — абураецца спадарыня Вяргейчык.

Падобная карціна назіралася і на ўчастку 485.

Найбольш дзівіць спадарыню Вяргейчык, што большасьцю выбарцаў авалодала безнадзейная апатыя. «Усё і так за нас вырашана», — кажуць яны, панура апусьціўшы рукі.

**Яраслаў Сьцешык, Алесь Бондар**

### І ў Магілёве пісалі 70

Сталі вядомыя зьвесткі па Магілёўскай Прамысловай акрузе № 87. Паводле вынікаў пратаколаў, за сацыял-дэмакрата Расюка прагаласавала 20,7%, а за кандыдата з уладнага сьпісу Мельнікава — 70,8%. Дзівосным чынам у такіх розных рэгіёнах краіны кандыдаты-лукашэнкаўцы дасягалі аднолькавага працэнту галасоў: 70 плюс-мінус 2. Напрыклад, супернік сацыял-дэмакрата Ляўковіча ў Берасьці набраў 68%, суперніца адваката Казуліна Ігара Рынкевіча ў Менску — 70 (усё гэта папярэднія лічбы, паводле копіяў пратаколаў, выдадзеных кандыдатам). Дарэчы, найменшую лічбу ў магілёўскіх акругаў пратаколы даюць БРСМаўцу Юшкевічу — 64%. Дык жа ў яго было 4 суперніка, і 70 тут было ўжо ніяк не дасягнуць.

### Меху не да сьмеху

Калі верыць пратаколам, знакаміты Аляксандар Мех атрымаў у Кобрыне 9,2 % галасоў. Цікава, што гэта 4060 галасоў пры тым, што толькі подпісаў за яго вылучэньне было сабрана 4080. Перамог жа бізнэсовец Аляксандар Зазуля з 53,3%.

### Пазьняк: у выбарах узялі удзел 25—30 %

Старшыня Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ Зянон Пазьняк лічыць, што ў парлямэнцкіх выбарах у Беларусі ўзяло ўдзел толькі каля 25—30% грамдзян краіны. «28 верасьня па ўсёй Беларусі былі зафіксаваныя пустыя ўчасткі. Гэта пацьвярджаецца ўсімі нашымі назіральнікамі. Рэжым хоча гэта схаваць, але гэта вельмі няўдала», — кажа З.Пазьняк.

**МБ; АА, Магілёў**

# Адзін дзень з кандыдатам

Карэспандэнт «НН» **Сямён Печанко** правёў дзень выбараў у Горадні. Сёлета кандыдаты ад апазыцыі зрабілі акцэнт на сацыяльных пытаньнях — ільготах, жыльлёвых праблемах, кантрактнай сыстэме, праблемах маладых сем'яў. Гэта мела заўважны водгук з боку грамадзянаў.

З кандыдатам ад Партыі БНФ Сяргеем Антусевічам мы найперш выправіліся на вуліцу Белуша. У гэтым раёне сям'я Антусевіча восьвось паселіцца, і кандыдат хацеў прагаласаваць за сябе менавіта тут. «Каб ня выбары, то даўно б засяліліся», — усьміхаўся Сяргей. Ягонаму сыну 9 гадоў, уласнага жыльля Антусевічы чакалі на год болей. Па дарозе гаварылі пра асаблівасьці сёлетняй кампаніі. Найбольш пазытыўны момант — магчымасьць кантакту з выбарцамі на вулічных пікетах і ў часе збору подпісаў — менавіта тое, чаго апазыцыя пазбаўленая ў астатні ад выбараў час. Лукашэнка з тэлеэкрану жаліцца, што «апазыцыя ня хоча ісьці да людзей», а тым часам любы такі крок скончаецца арыштам і штрафам. На гэты раз увага з боку грамадзянаў была вялікая: «Людзі тэлефанавалі па пазначаных на ўлётках нумарах і размаўлялі са мной, фактычна, як зь дзейсным дэпутатам». Пачалі гарадзенцы асвойваць і сувязь праз Сеціва — дасылаюць электронныя лісты. Па той бок таксама ня сьпяць — канкурэнту Антусевіча, былому рэктару, дэпутату палаты Сяргею Маскевічу стварылі да выбараў сайт-аднадзёнку.

Пасьля кароткай спрэчкі са старшынёй камісіі, якая хоць і добра ведала Сяргея, але не адмовіла сабе ў задавальненьні праверыць ягоныя пашпартныя зьвесткі, кандыдат у дэпутаты ўкінуў у скрыню бюлетэнь. Вяртаючыся ў штаб, апазыцыянэр расказаў пра тое, як ўспрымалі выбарцы яго праграму. Сёлета кандыдаты ад БНФ адмовіліся ад старых штампаў ды зрабілі акцэнт на сацыяльных пытаньнях — страчаных ільготах, жыльлёвых праблемах, кантрактнай сыстэме, праблемах маладых сем'яў. Гэта мела заўважны водгук з боку грамадзянаў, кажа Антусевіч. Некаторыя выказвалі жаданьне запісацца ў шэрагі партыі, а хтосьці перадумаў адседжвацца ў дзень выбараў дома.

У Аграрным унівэрсытэце было нешматлюдна — да суботы прагаласавала амаль 60% студэнтаў. Арганізатарка сьвяточнага канцэрту бедавала, што за хвіліну да імпрэзы заля зусім пустая. Каля стэнду з праграмамі дзядуля ня мог вызначыцца з выбарам: «Бээнэфавец? Цікава! Былы дэпутат? Наеўся ўжо! Лібэ-



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Выбары не прызналі,
## але дыялёг усё яшчэ магчымы

Нягледзячы на некаторыя нязначныя паляпшэньні, парлямэнцкія выбары 28 верасьня ў Беларусі не адпавядалі стандартам АБСЭ для дэмакратычных выбараў, сказала ў панядзелак Ан–Мары Лізэн, віцэ–прэзыдэнтка Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ.

«Выбары адбыліся ў жорстка кантраляваных умовах, і выбарчая кампанія была практычна незаўважная. Сам працэс галасаваньня быў наладжаны добра, але значна пагоршыўся падчас падліку галасоў», — гаворыцца ў заяве назіральнікаў.

На 48 працэнтах участкаў, якія наведалі назіральнікі АБСЭ, яны ацанілі працэс падліку галасоў як «кепскі» ці «вельмі кепскі», адзначае радыё «Свабода».

«На жаль, выглядае, што неаднаразовыя сыгналы добрай волі не былі правільна дадзеныя альбо прынятыя. Адпаведна, той значны прагрэс, на які мы спадзяваліся ў дэмакратычным разьвіцьці Беларусі, не матэрыялізаваўся», — сказала спн. Лізэн.

Парлямэнцкія выбары ў Беларусі ў значнай меры не адпавядалі міжнародным стандартам, заявіў у панядзелак намесьнік начальніка прэс-службы Дзяржздэпартамэнту ЗША Робэрт Вуд. Аднак ён папярэдзіў, што выказвае толькі папярэднюю ацэнку адміністрацыі Дж. Буша.

Страчаным шанцам для Беларусі назваў выбары 28 верасьня генэральны сакратар Рады Эўропы Тэры Дэвіс. «Лукашэнка ніколі не прапускае магчымасьці прапусьціць магчымасьць. Існавала надзея, што нядаўнія выбары стануць паваротным пунктам у добраахвотнай ізаляцыі Беларусі ад рэшты Эўропы. На жаль, гэтага ня здарылася», — зазначыў Дэвіс у заяве з нагоды выбараў.

Заклапочанасьць у сувязі з вынікамі парлямэнцкіх выбараў у Беларусі выказала Францыя, якая цяпер старшынюе ў Эўрасаюзе.

У аўторак жа Лукашэнка сустрэўся з Ан-Мары Лізэн. Як паведамляюць дзяржаўныя агенцтвы, Лукашэнка сказаў, што Беларусь чакае ад Эўропы адмены ўсялякіх санкцый, якія эўрапейцы ўвялі.

Варта адзначыць тон дзяржаўных СМІ, якія паведамляюць, што выбары прайшлі згодна з заканадаўствам, а АБСЭ прызнала «значнае паляпшэньне ў іх правядзеньні».

Нават нягледзячы на непрызнаньне выбараў легітымнымі многія палітыкі на Захадзе па-ранейшаму зьяўляюцца прыхільнікамі далейшага дыялёгу зь Беларусьсю. Прынамсі пра гэта заявілі ў МЗС Літвы. «Выбары ў парлямэнт сытуацыю не зьмянілі, але дыялёг патрэбен», — гаворыцца ў заяве.

«Нямеччына застанецца партнэрам Беларусі і пасьля парлямэнцкіх выбараў», — сказаў пасол гэтай краіны Гэбхард Вайс.

Камісар па замежных сувязях і эўрапейскай палітыцы добрасуседзтва Бэніта Фэрэры-Вальднэр таксама распаўсюдзіла заяву, дзе заклікае ўрад Беларусі ўступіць у дыялёг з АБСЭ наконт таго, якім чынам ажыцьцявіць іх рэкамэндацыі.

«Зараз для ЭС важна падумаць, як нам найлепш разьвіваць адносіны зь Беларусьсю, яе ўрадам і яе народам», — адзначае Фэрэра-Вальднэр.

«ЗША не прызнаюць беларускіх выбараў, але будуць шукаць магчымасьці, каб будаваць адносіны», — заявіў БелаПАНу кіраўнік амэрыканскага пасольства ў Менску Джанатан Мур. Дарэчы, ня выключана, што менавіта Мур стане новым паслом Штатаў у Беларусі.

Здаецца, што непрызнаньне легітымнасьці выбараў усё ж ня спыніць заходнія краіны ў імкненьні да дыялёгу зь Беларусьсю.

**Зьміцер Панкавец**

# Хай Эўропа пацалуе ў дыяфрагму

Меней за ўсё можна было чакаць, што назаўтра пасьля даволі жорсткага папярэдняга заключэньня назіральнай місіі АБСЭ Аляксандар Лукашэнка сустрэнецца з мадам Лізэн. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Болей чаканым быў бы матыў «но сурово брови мы насупим». Напачатку споўксмэн МЗС так інэрцыйна і зрабіў, папікнуўшы місію, што не ацаніла як сьлед дэмакратычнага шчыраваньня Менску.

Але потым быў намацаны бліскучы піяр-ход (няўжо зноў лорд?). Беларускае начальства стала рабіць выгляд, што ў папярэдняй справаздачы назіральнікаў АБСЭ ўсё ціп-топ.

Зь вечаровага рэпартажу «Панарамы» глядач мог зрабіць выснову, што той даклад — амаль што камплімэнтарны. Прычым канчатковая справаздача (недзе цераз месяц) можа аказацца яшчэ лепшай. Бо гаспадар сустрэчы мякка паставіў адпаведныя задачы перад функцыянэркай з Эўропы, нібыта перад Сідорскім ці Пракаповічам. Прагучала: «Мы, вядома ж, чакаем ад вас большага, чым вы сказалі папярэдне...»

Дарэчы, дзяржаўныя мэдыі зрабілі выгляд, што не існуе суворага пасла Арэнса з БДІПЧ, які ў місіі дэ-факта «старэйшы па званьні». А самавітая мадам (што была толькі каардынаткай кароткатэрміновых назіральнікаў АБСЭ) у заключным кадры атрымала ад гаспадара шыкоўны букет, і атрымаўся сапраўдны хэпі-энд, хіба што без пацалунка ў дыяфрагму.

Разьлік геніяльны. Ну хто з паспалітага люду будзе вышукваць першакрыніцу-даклад? Затое многія глядзелі ток-шоў, калі спн. Ярмошына заявіла, што высновы назіральнікаў АБСЭ «выклікаюць аптымізм». У выніку наіўныя беларусы шчыра павераць: Эўропе выбары ўвогуле спадабаліся, ну а калі там трохі носам і круцяць, дык мы выстрэнчваць ня будзем. Яны нам яшчэ за карычневую чуму вінныя…

Ва ўмовах мэдыйнай манаполіі выдатна працуюць «інфармацыйныя тэхналёгіі» з оруэлаўскай антыўтопіі. Гэта калі казаць пра ўнутраны кантэкст. Ды і замежны кантэкст спрыяе.

Эўропа перад галасаваньнем столькі сакатала пра «станоўчыя сыгналы» зь Менску, што цяпер — як мыла зьеўшы. Трэба захоўваць твар. Ну ня скажаш жа, што, вось, былі закулісныя дамоўленасьці — і нас «кінулі». Ня той слэнг для шаноўнага сп. Саляны.

Так што інтарэсы беларускай вярхоўкі ды заходніх функцыянэраў тут парадаксальна супалі. Абодва бакі вырашылі на справаздачу назіральнікаў АБСЭ — скажам так — надта не зважаць.

Ня толькі зь Вільні (што цалкам чакана), але і з Брусэлю, і нават з Вашынгтону прагучалі заявы з канструкцыяй «нягледзячы на…». Канечне, маўляў, трыюмфу празрыстасьці не было, але ад дыялёгу мы не адмаўляемся. Будзем цярпліва выхоўваць беларускі ўрад у духу дэмакратыі. Ну то хай запасаюцца цярпеньнем.

Дарэчы, яшчэ два піяр-хады. Лукашэнка дыдактычна перасьцярог спн. Лізэн, каб Захад не вымагаў збліжэньня коштам пагаршэньня дачыненьняў з Расеяй. А ў Цхінвалі на імя Какойты ад беларускага кіраўніка пайшоў ліст з абяцаньнем, што новы парлямэнт разгледзіць вядомае пытаньне (без аніякіх, заўважце, гарантыяў станоўчага рашэньня). І тут усё зразумела: 6 кастрычніка ў Менск прылятае Пуцін, каб пагаварыць пра газ ды крэдыт. Таму трэба і нашым і вашым.

Торг на два бакі доўжыцца. Прычым Менск віртуозна гандлюе паветрам.

рал? Гэта жырыновец? Не? Усё адно блазан!»

Назіральнікі Антусевіча фіксавалі дробныя парушэньні: нехта пабачыў у сьпісах выбарцаў даўно памерлага сваяка, недзе скрыня была дрэнна бачная. Максіму Губарэвічу ўдалося злавіць большую рыбу: ён знайшоў акт аб правядзеньні галасаваньня, складзены адным з назіральнікаў а... 15-й гадзіне, які сьведчыў, што «выбары прайшлі без парушэньняў заканадаўства».

Байкотам у Горадні і ня пахла. «Які можа быць байкот пасьля таго, як кандыдаты зарэгістраваліся і пачалі зьбіраць подпісы?» — дзівіўся Антусевіч. Калі байкатаваць, то ўсім і адразу. Затое хістаньні ў стане апазыцыі пасеялі паняверку сярод шараговых актывістаў. Гарадзенскі БНФ здолеў-такі накрыць сваімі людзьмі 100% участкаў, але толькі па адным прадстаўніку. Ня верыць у байкот і кандыдат ад АГП Яраслаў Раманчук. «Мы правялі ці не найлепшую кампанію ад 2001 году, калі казаць пра сувязь з выбарцамі», — мяркуе ён. Ягоны штаб здолеў наладзіць назіраньне на 90% участкаў.

Нікога не пасадзілі на суткі, амаль не перашкаджалі сустракацца з выбарцамі, чорнага піяру амаль не было, хіба толькі Раманчука невядомыя зьвінавацілі ў спробах далучыць Гарадзеншчыну да Польшчы — вось нешматлікія зрухі ў дзеяньнях улады, адзначаныя дэмакратамі. Але пра поўную свабоду дзеяньняў гаварыць не даводзіцца і блізка. Найгорш было кандыдатам, што супернічалі з кіраўніком гарвыканкаму Аляксандрам Антоненкам.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Сяргей Антусевіч пра ўдзел не шкадуе.**

Пазытыўны момант — кантакты з выбарцамі на пікетах і ў часе збору подпісаў — тое, чаго апазыцыя пазбаўленая ў астатні ад выбараў час.

Тут за галасы выбарцаў змагаліся кандыдат ад Партыі БНФ Вадзім Саранчукоў, былы палітвязень, прадпрымальнік Аляксандар Васільеў ды выкладчык Сяргей Кузьмянок ад незарэгістраванага «Руху «За Свабоду».

Увечары выбарцаў на ўчастках пабольшала, а свабода дзеяньняў назіральнікаў пачала звужацца з набліжэньнем падліку галасоў. У камісіях рабілі выгляд, што лічылі, а рэальна запісвалі тыя лічбы, якія ім былі спушчаныя зьверху, лічыць Сяргей Мальчык. Найбольш пытаньняў выклікалі некантраляваныя назіральнікамі папярэдняе галасаваньне і абход кватэраў з вынаснымі скрынямі.

Вынік выбараў быў прадказальны, але гарадзенскія палітыкі відавочна не шкадуюць пра ўдзел: выхад у народ і, адпаведна, рэакцыя месьцічаў на гэта пасялілі ў іх аптымізм — нас не забылі, нашыя ідэі не чужыя людзям.

*Горадня—Менск*

# Вачыма загнаных

Працяг са старонкі 2.

Нязвыклае да палітычнага плюралізму і грамадзянскага кантролю насельніцтва не канечне зьвяртае ўвагу на такую тонкасьць як ідэалягічная вэртыкаль — фактычна, напаўпартыя і напаўспэцслужба ў выключным распараджэньні адной палітычнае сілы, ды яшчэ й аплачаная з кішэні падаткаплатніка. Або на такі казус як фармаваньне выбарчых камісій — уявіць сабе, што судзьдзяў матчу падбірае і аплочвае адна з камандаў. Але людзі чуйна адзначаюць аднабаковую прапаганду дзяржаўных СМІ, якія ніколі не даюць слова палітычным праціўнікам і ніколі не абмяркоўваюць А.Лукашэнку, і асабліва выяўна адцемліваюць загон на датэрміновае галасаваньне.

Улады так і не змаглі ўцямна патлумачыць, для чаго трэба галасаваць зачасу. Гэтаму сапраўды няма ніякіх апраўданьняў — у суседніх краінах датэрмінова галасуе 1—2 % выбарцаў, а ў некаторых краінах з падобнай да беларускай «крэдытнай гісторыяй» барацьбы за ўладу гэтая лічба нават адмыслова абмежаваная законам. Нават у савецкія часы ніякага датэрміновага галасаваньня не было.

Лічбы выбарцаў, што прагаласавалі датэрмінова, ізноў рэкордныя, большыя, чым у 2004, і, магчыма, нават у 2006 гадах. Як тая савецкая курыца вымушана была, можаш ня можаш, штогод павялічваць яйцаноскасьць, так і Лідзія Ярмошына. Абвесткі пра абавязковасьць датэрміновага галасаваньня вісяць у многіх прадпрыемствах і ўстановах. Сьпісы тых, хто прагаласаваў, правяраюць. Людзі адчуваюць сябе кантраляванымі і абавязанымі — у такіх псыхалягічных сытуацыях яны галасуюць як трэба. Але галасуючы за, яны пры гэтым не ўспрымаюць выбары як чэсныя.

Гэта прычынаю такой хісткасьці лукашэнкаўскай сыстэмы ўлады, якая ўдае сябе маналітам.

Людзі пакорліва ўдзельнічаюць у працэдурах легітымізацыі ўлады, пакуль «альтэрнатывы няма». Гэта значыць, пакуль у паветры не зьяўляецца адчуваньне імавернасьці пераменаў. І тады сыстэма рушыцца, як замак зь пяску.

Пэўная група палітычных аглядальнікаў любіць разважаць пра легітымнасьць, разумеючы пад ёю фармальнае прызнаньне вынікаў законнымі з боку краінаў Захаду і міжнародных арганізацый заходняга сьвету, забываючы, што галоўная легітымнасьць — гэта ацэнка палітычнага факту законным і справядлівым самімі грамадзянамі. Выбары, на якіх датэрмінова галасаваць загналі траціну выбарцаў, ніколі ня будуць прызнаныя тымі загнанымі як нармальныя.

Як жа дзейнічаць у такой сытуацыі грамадзянам? Апраўдана рабіць найбольш сумленны выбар з магчымых нават у сытуацыі, калі адкрыты пратэст немагчымы. Калі ў акрузе няма нацыянальнага і дэмакратычнага кандыдата, трэба такія выбары байкатаваць ці галасаваць супраць усіх. Калі такі ёсьць, трэба аддаць голас яму. На абвешчаны вынік працэнту ўдзелу і галасоў за лукашэнкаўскі сьпіс гэты байкот ці ўдзел, ясная рэч, не паўплывае — ілюзій тут ня трэба — але маральны ціск на камісіі і ўладны клан будзе, і гэта ўжо важна.

# Жалезныя злачынцы

Піша **Руслан Равяка**.

На каналах БТ прамігцелі кадры пра посьпехі беларускіх спэцслужбаў на Баранаўшчыне.

Злавілі вялікага злачынцу — прадпрымальніка, што вывозіў мэталалом у Расею. Прыкрываючы яго бульбаю. Але хлопец здуру дэкляраваў на беларускай мытні бульбу, а на расейскай — ужо мэтал.

Так цягнулася не адзін год, нашыя супрацоўнікі адпаведных органаў, выпадкова атрымаўшы зьвесткі, жахнуліся — на колькі недаатрымала дзяржава сродкаў.

Журналіст БТ прыехаў нават пад Гарадзішча, дзе прадпрымальнік рабіў сваю чорную справу. У кадар трапіў дабіты аўтобус, рэшткі ржавага трактара, сьмецьце… Колькі счарнелых ад сялянскай працы і гарэлкі мужыкоў у ватоўках ды вязаных шапках разьбіралі нейкую машыну. На пытаньні журналіста мыркаюць сабе пад нос, што займаліся рамантаваць трактар.

Журналіст трыюмфуе. Распавядае акалічнасьці затрыманьня, называе шалёныя сумы нядоімак. Пасьля між іншага дадае, маўляў, цэны на мэталалом у Расеі зноў пайшлі ў гору, а ў нас зьменшыліся.

Бязмытнік злоўлены, дзяржава атрымае «неўзысканыя» грошы, праца органаў паказаная падаткадаўцам.

Паўстае адно пытаньне.

Калі б цана мэталалому была б у Беларусі рынкавая, ці цягнуў бы чалавек яго за мяжу?

Здаваў бы тут і гора ня знаў. Калі б чалавек не зьбіраў таго мэталалому, а пакінуў бы яго далей іржавець на паветры, ці атрымаў бы бюджэт што-небудзь наагул? Дырэктыва № 3 патрабуе зьберагаць рэсурсы, але па сутнасьці пытаньня перапрацоўкі другаснай сыравіны не чапае. Галоўнае — заклееныя вокны, усталяваныя вадамеры, зацьверджаныя праграмы «мераў».

Апошнім часам я заўважыў, што валацугі й апівошы ня вельмі падкімі сталі да макулятуры і старога жалезьзя. Калі

> Прадпрымальнік вывозіў мэталалом у Расею, прыкрываючы бульбаю.

выносіш сьмецьце, бачна, як тыя, корпаючыся ў кантэйнэрах, абмінаюць іх. Відаць, «нарыхтоўка» тых нават для іх больш не ўяўляе цікавасьці.

Калі цана падае, можна зрабіць выснову, што ці другасная сыравіна не патрэбная, ці яе гэтулькі, што немагчыма ў найбліжэйшым часе перапрацаваць. А значыцца, замала магутнасьцяў.

Вываз лому зь Беларусі ў Расею магчыма параўнаць з колішнім вывазам кілбасы ды сьмятаны. Покуль будзе выгадна, будуць вазіць.

Віна прадпрымальніка, што парушаў закон, — плаціў дзяржаве ня як за чорны мэтал, а як за бульбу.

Кадры з тэлебачаньня яшчэ раз выявілі сутнасьць нашай сыстэмы. Пасьпяховаму чалавеку, які знаходзіць як зарабіць сабе і дае яшчэ працу іншым (на маю думку, ня так і добра ў калгасах, калі людзі працуюць у прадпрымальніках па нарэзцы жалеза), немагчыма зарабляць, не парушаючы закону.

**Ад Рэд.** Зьвярнула ўвагу, што аналягічнае «журналісцкае расьсьледаваньне» ў аўторак на першай паласе надрукавала «Советская Белоруссия». Ці ня знак гэта палітычнага заказу? У газэце падкрэслена: усё тое адбывалася з прычыны празрыстай мяжы з Расеяй.

# Нарачанскі пуп

Нарачанскі край унікальны ня толькі самым вялікім у Беларусі возерам і курортам. Хоць, магчыма, з гэтага пачынаюцца і ўсе іншыя тутэйшыя цуды. Якая чыстая на Нарачы беларуская мова! Здаровая, як тутэйшае хваёвае паветра, і спрадвечная, як генатып мясцовых людзей. Піша **Сяргей Дубавец**.

Калі парлямэнт РБ прыме нарэшце закон аб беларусізацыі ўсіх сфэр нашага жыцьця, трэба будзе чыноўнікаў масава адпраўляць у нарачанскія лягеры, дамы адпачынку і санаторыі, каб пэрсанал гэтых установаў — нарачанскія, мядзельскія, нарацкія, крывіцкія, купскія людзі — разам са здароўем паправіў ім прызабытае вымаўленьне.

Дзіўна. Здавалася б, пры такой пільнай увазе да Нарачы менскага начальства яшчэ з савецкіх часоў тут даўно не павінна было застацца і сьледу беларушчыны. Насамрэч усё наадварот. У адрозьненьне ад іншых месцаў краіны, дзе вёска ўсімі сіламі рвалася ў горад і церазь немагу выгнятала зь сябе прыкметы паходжаньня, тут ня рваліся. Ні пад каго не падладжваліся. Гэта горад (той, што з учорашніх вёсак) ірваўся сюды. У адрозьненьне ад іншых, якія па выніку пачуваліся ці то паніжанымі перад горадам у вёсцы ці то прыежджымі ў горадзе, словам, людзьмі другаснымі і часовымі адносна «стацыянарных» гарадзкіх, нарачанцы былі й застаюцца тымі стацыянарнымі, адносна каго гарадзкія рускамоўныя пачуваюцца часовымі, прыежджымі, ці то просьбітамі, ці то кліентамі.

Рэдкае месца, дзе беларус адчувае сябе пупом сьвету на сваім месцы, — тут.

Нішто не пагражае гэткаму парадку рэчаў і ў будучыні. Курорт разьвіваецца. Тысячы нарачанцаў — лекараў, пекараў, сантэхнікаў, дворнікаў, муляраў — забясьпечваюць працу ўсёй гэтай зоны адпачынку, гандлююць на рынках, будуюць дамы…

Нарачанскі чалавек — самавіты, спакойны і годны як Максім Танк. Ён ня мае патрэбы малпаваць тых высокіх і нізкіх чыноў, людзей менскіх (!) ці піцерскіх ці арэхавазуеўскіх, якім паліць лазьню, варыць юшку, слухае сэрца ці робіць падводны масаж. Яны заўтра зьедуць, прыедуць і зьедуць наступныя, а ён застанецца.

Мне даводзілася назіраць унікальныя для Беларусі сцэны: прыежджыя кліенты пры ўсёй іх пыхлівасьці і «гарадзкім» налёце раптам ператвараюцца ў гасьцей, кім яны тут і ёсьць, і, самае галоўнае, прымаюць тыя правілы гульні. (Унікальнасьць у тым, што беларус паводзіць сябе, нібы гэта які літовец, прычым без намаганьня, натуральна, ён тут дыктуе лад і склад дачыненьняў!).

Атмасфэру, у якой усё становіцца з галавы на ногі, ствараюць самі нарачанцы. Дужыя людзі, патомныя рыбакі, што яшчэ за польскім часам падымалі паўстаньні супраць панскае ўлады. Адзін з самых трывалых рэгіёнаў што да захаваньня свае нацыянальнае годнасьці і роднае мовы.

Брава, Нарач!

**naviny.by, зь нязначнымі скаротамі**



АЛЕСЬ ПРЫШЫВАЛКА

# Пабачыць Дэль П’ера — і захапіцца Крыўцом

Працяг са старонкі 2.

Ну а калі Ігар Стасевіч перайграў у паветры самога Паўла Нэдвэда і падвоіў лік, то пачалося рабіцца нешта неймавернае! Увогуле, склалася ўражаньне, што ў той вечар у краіне не было абыякавых да футболу людзей. Акурат такія рэчы і здольныя гуртаваць нацыю.

«Ювэнтус» на тое і «Ювэнтус», што не паплыў па цячэньні, а змог пераламіць ход паядынку і лік зраўняць. Нічыя, натуральна, прынесла больш радасьці, чым расчараваньня, але недзе падсьвядома засела думка, што маглі і перамагчы.

На пасьляматчавай прэс?канфэрэнцыі галоўны трэнэр БАТЭ на эмоцыях выгаварыўся пра ўсю, што баліць.

Ён наракаў на айчынных журналістаў, якія перад гульнёй не надзялялі ягонай камандзе ніякай увагі, а ўся іх увага была сканцэнтравана на славутых гасьцях. «Мы ведаем усе пра Дэль П’ера, Нэдвэда, але нічога ня ведаем пра Радзівонава, Крыўца, Хагуша…», — з крыўдай у голасе сказаў Ганчарэнка.

Напэўна, факт выхаду БАТЭ ў групавы турнір усё яшчэ ўспрымаўся ўсімі намі як нейкі шчасьлівы зьбег абставінаў, выпадковасьць. Таму і ўвага нашая найперш была прыкаваная не да Няхайчыка і Стасевіча, а да замежных зорак.

Хочацца верыць, што гульня зь «Ювэнтусам» канчаткова разбурыць такія стэрэатыпы. І людзі будуць хадзіць на стадыёны не для таго, каб пабачыць Дэль П’ера ці некага яшчэ. Хочацца верыць таксама, што прыйшоў час новых куміраў, і не адзін я зьбіраюся бліжэйшым часам купіць майку з прозьвішчам Сяргея Крыўца.

**Зьміцер Панкавец**



Гульцы БАТЭ на лаве запасных.

# Ня хлебам адзіным

Пару тыдняў таму патэлефанаваў мне сваяк з Масквы. — Ну, як там у вас на рынках, у Беларусі? — А што на рынках? Усё ў парадку. Праўда, цэны кусаюцца. Бульба паўдаляра за кіляграм... — Ды не, — кажа сваяк — я не пра сэзонныя рынкі, а пра фондавыя, што гандлююць каштоўнымі паперамі. Дык як там у вас каціроўкі: ідуць уніз, ці ўверх? Піша **Віталь Тарас**.

Сорамна было прызнацца, што фондавых біржаў у Беларусі няма — прынамсі, наколькі мне вядома. А пра індэксы каштоўных папераў рэгулярна даводзіцца чуць хіба што ў рэкляме страхоўкі: «індэкс Доў Джонса зноў упаў — ніякіх нэрваў не хапае…»

### Як наесьціся за 5 фунтаў

У пярэдадзень выбараў давялося правесьці некалькі дзён на лецішчы. І пры гэтым, як заўсёды, харчавацца пераважна бульбай. У розных выглядах. Адзінае, чаго не хапала для поўнага шчасьця, дык гэта тэлевізара. Увечары дапамагаў бавіць час кароткахвалевы прымач. Заходнія радыёгаласы асаблівай разнастайнасьцю тэмаў ня радавалі. У асноўным размова вялася пра сусьветны фінансавы крызіс і крыху пра выбары — у ЗША. Пра выбары ў Беларусі можна было даведацца па «Свабодзе» і крыху зь перадачаў Бі-Бі-Сі. Але найбольш уразіла перадача брытанскай радыёкарпарацыі, прысьвечаная тэме ежы, у прыватнасьці — бульбе.

Вядоўца апавёў пра тое, што фінансавы крызіс у Англіі, канечне ж, адчуваецца. Брытанцы нічога добрага ў блізкай пэрспэктыве не чакаюць. (Праўда, адна жанчына-эканамістка ў перадачы аптымістычна заявіла: цяпер акурат той час, калі трэба распачынаць бізнэс. Праўда, крэдыт узяць будзе цяжэй, але ж канкурэнцыі на рынку паменела. Трэба ўсяго толькі мець стартавы капітал.)

А тым часам працягвае давацца ў знакі сусьветны харчовы крызіс. І ў сувязі з гэтым у кнігарнях Лёндану вельмі добра прадаецца апошнім часам кухарская кніжка «Як прыгатаваць сьнеданьне за 5 фунтаў». Запомніў нават рэцэпт з тае кнігі, прачытаны брытанскім радыёжурналістам. Трэба купіць у супэрмаркеце пачак самай таннай макароны, каб пры гатаваньні яна разварылася на ўвесь гарнец. Потым дадаць да яе фарш з індычкі. Калі ў доме ёсьць алей, добра яго спачатку падсмажыць. Калі не — можна проста зтатаваць. Відаць, макарону па-флёцку вынайшлі некалі ў старой добрай Англіі.

Успамінаецца папулярны за савецкім часам рэцэпт з кулінарнай кнігі, нібыта выдадзенай у царскай Расеі. Калі да вас нечакана прыехалі госьці, а ў вас дома няма прадуктаў, не губляйцеся — адпраўце пакаёўку ў сутарэньне па халодную гатаваную цяляціну. Падайце яе (цяляціну) на стол з хрэнам, тонка нарэзанай. Госьці будуць задаволеныя.

Усё задавальненьне з макароны й фаршу ў Брытаніі будзе каштаваць ня больш за 5 фунтаў. Перш чым перавесьці гэтую суму на беларускія рублі, дарэчы будзе згадаць яшчэ адзін стары анэкдот: адзін фунт стэрлінгаў роўны аднаму фунту савецкіх рублёў. Беларускіх рублёў спатрэбіцца значна меней — недзе каля 20 тысячаў. Але, падумалася мне, гэтых грошай хопіць, каб купіць пару боханаў хлеба, пачак масла, пакет малака, пакет сьмятаны, кілё каўбасы ды яшчэ застанецца «на выпіць». Альбо можна купіць, як мінімум, дваццаць кілё бульбы і есьці яе тры тыдні з скваркамі. А сала ж, пэўна, знойдзецца ў заначцы.

### Дранікі vs бліны з палтусам

Пра дваццаць кілё бульбы на тры тыдні — гэта не перабольшаньне. Гэта статыстыка. Паводле яе (калі верыць Бі-Бі-Сі) сярэднестатыстычны беларус зьядае за год 340 (!) кіляграмаў бульбы. Гэта першы паказчык у сьвеце. Для параўнаньня — сярэднестатыстычны француз спажывае за год няшчасныя 33 кіляграмы крухмалістых клубняў.

Нейкая кабета — ці то дыетоляг, ці то культуроляг зь Беларусі ў інтэрвію згаданай радыёперадачы абуралася: няма нічога больш несумяшчальнага й шкоднага для арганізму як заскваранaя бульба. Бульбу ў смажаным і гатаваным выглядзе, а таксама дранікі, калдуны й клёцкі як пачалі есьці беларусы гадоў дзьвесьце таму, так і ядуць дагэтуль, асабліва не ламаючы галавы над новымі рэцэптамі. І яшчэ ганарацца сваёй кухняй, хоць ва ўсім сьвеце бульба лічыцца ў гастранамічным пляне абсалютна нецікавай стравай з шэрым, невыразным смакам.

Між тым, каралі кулінарыі французы апошнім часам устурбаваліся тым, каб гэты прадукт зрабіць больш папулярным у сваёй краіне (харчовы крызіс, не забывайцеся!) Як вам, да прыкладу, бульбяныя бліны з палтусам і салатай рокалі? Альбо гатаваная бульба з чырвонай ікрой і соўсам з кропу?

Нам з бульбай, ясна, ніякі крызіс ня страшны. Ну, хіба бэнзін і дызэльнае паліва падаражэе — тады, мабыць, вазіць ураджай у багажніку «Мэрсэдэсу» стане ня надта рэнтабэльна. Але бэнзін — гэта ўжо пытаньне да Расеі, а не да Захаду.

### Дэпрэсія без самагубстваў

Масавых самагубстваў банкіраў, нягледзячы на разарэньне буйных заходніх інвэстбанкаў на Захадзе, пакуль, дзякаваць Богу, не назіраецца. Кіраўніцтва збанкрутаваных паспадзявалася на шматмільённыя прэміяльныя (так званых «залатых парашутаў») у сувязі са звальненьнямі. Праўда, гэтым разам, відаць, не дачакаецца. Тым часам, у вядучых краінах Захаду захоўваецца рост вытворчасьці (хоць ён і запаволіўся), няма масавага беспрацоўя, ня відаць, нягледзячы на крызіс на рынку нерухомасьці, натоўпаў бяздомных.

Многія параўноўваюць цяперашні крызіс зь Вялікай дэпрэсіяй, якая паставіла цягам 1929—1933 гадоў на калені эканоміку ЗША, Вялікай Брытаніі, Нямеччыны, Францыі… Тады ў Маскве ганарыліся тым, што сацыялістычная эканоміка, у адрозьненьне ад капіталістычнай, на ўздыме і крызісаў ня ведае ў прынцыпе. Якой цаной даўся той «уздым» — пра калектывізацыю, Галадамор ды Гулаг — успамінаць ня любяць.

Пра сацыялізм цяпер загаварылі нават у ЗША, апірышчы капіталізму. Міністэрства фінансаў хацела выкупіць за 700 000 000 000 даляраў непэрспэктыўныя пазыкі буйных інвэстыцыйных кампаніяў, каб банкаўская сыстэма выстаяла і банкі змаглі крэдытаваць адно аднаго.

Але асаблівасьці капіталістычнай дэмакратыі ў ЗША палягаюць у тым, што рашэньне аб гэтым прымае не кіраўнік выканаўчай улады, не кангрэс і не Фэдэральная рэзэрвовая сыстэма, а ўсе разам, пасьля доўгай і зацятай дыскусіі. Ды яшчэ з удзелам абодвух кандыдатаў на прэзыдэнты ад дэмакратаў і рэспубліканцаў. Дык вось, Кангрэс не ўхваліў прапановы ўраду.

І тым ня менш, шмат каму з заходніх эканамістаў не падабаецца сама ідэя ўмяшаньня дзяржавы ў эканоміку. Бо выходзіць, што калі ты пасьпяхова гуляеш на біржы, усе бонусы твае, а калі ты церпіш крушэньне — таксама нічога страшнага, усё адно дзяржава ўратуе…

Тым, хто забыўся, чым ёсьць насамрэч дзяржаўнае рэгуляваньне, варта ўспомніць нядаўнюю сытуацыю на біржах Расеі. Спачатку там цягам двух дзён каціроўкі самых буйных карпарацыяў падаюць на 15—20%. «Газпром», напрыклад, губляе 20 мільярдаў даляраў (супастаўце з стабілізацыйным крэдытам РФ для Беларусі памерам 2 мільярды). Але Цэнтрабанк укідвае трыльён расейскіх рублёў на рынак, і ўжо празь дзень той самы «Газпром», а таксама «Роснефть», «Нарыльскі нікель» і многія іншыя гульцы, набліжаныя да Крамлю, вяртаюць сабе страчанае. У выніку працу біржаў даводзіцца часова спыняць, каб ўратаваць рынак акцыяў ад «перанаграваньня».

Беларусі, вядома, нічога падобнага ў блізкім часе не пагражае. Калі нават уявіць, што ў РБ зьявіцца фондавая біржа, наўрад ці яна будзе рэагаваць на замежнапалітычныя фактары. А беларускі рубель адносна заходніх валютаў толькі мацнее. Праўда, Пуцін намякнуў, што насьпеў час РБ разьлічвацца за расейскі газ расейскімі рублямі… Пры гэтым не ўдакладніў, паводле якога курсу.

Але ж тое калі будзе. І ці будзе ўвогуле? Пакуль будзем есьці бульбу з салам. Няздарова, затое сытна й смачна. Нават без ікры.

# А дзе ў вас іншы Глобус?

Паліфанічнае інтэрвію.

## Што даў нам Адам Глобус?

**Ганна Кісьліцына:** Найперш, актывізаваў новыя жанры ў беларускай літаратуры. Калі ў 2000-я даў нам інтэрнэт-раман, дык у 1990-я зьявіліся адкрыцьцём яго эратычныя навэлі. А яшчэ песьнявая паэзія — для Касі Камоцкай і «Бонды». Тое, што для нас было тады вельмі пільна, актуальна для беларускай культуры.

Найлепшая кніга? «Дамавікамэрон». Люблю, калі кнігі пасьля паўторных прачытаньняў цьвяляць ці расчульваюць наноў. Мяне асабіста «Дамавікамэрон» сьмяшыць дагэтуль.

## Тым знакам, «Дамавікамэрон» forever?

**Сяргей Дубавец:** Не, найлепшая кніжка Глобуса яшчэ напішацца. А са зробленага — ягоны зборнік паэзіі «Парк», які ўвайшоў у гісторыю літаратуры як маніфэст цэлай групы літаратараў, не падобных да папярэднікаў, але падобных паміж сабою. Ужо тады Глобус-паэт адбыўся. Глобус-празаік, на маю думку, толькі пачынаецца. Ён практыкуецца, экспэрымэнтуе, робіць накіды. Але яго найлепшае апавяданьне — «Наша Ніва» са зборніка «Браслаўская стыгмата» — абяцае нам у будучыні зусім невядомага і зусім сталага Глобуса разам зь яго найлепшай кніжкай.

## Дык што — і жнец і швец і на дудзе ігрэц?

**Марыйка Мартысевіч:** Глобус — найперш кароль мініятуры. Асабліва хочацца вылучыць ягоныя «Казкі» — выдатна абмаляваная архітыповасьць і дасканалае міфастваральніцтва. Глобус зрабіў пасьлясавецкую літаратуру жывой. Нават нягледзячы на параскіданую там-сям мярцьвячыну ў сюжэтах. Нават нягледзячы на мізантрапічны настрой. Па-другое, чытаючы Глобуса, пазнаеш рэальных людзей, ня ў сэнсе пэўных асобаў, а тыпажы: людзі абмаляваныя надта праўдападобна. Перасадка цэлых кавалкаў жыцьця ў літаратуру робіць сваё.

## Літаратурная фатаграфічнасьць?

**Пятро Васючэнка:** Спосабам бачаньня Адам — не філялягічны пісьменьнік. Хутчэй мае неўласьцівую белліту зрокавую традыцыю прозы. Кідаецца ў вочы яго візуальны шэраг. Таму Глобус літаратурны — мастак хутчэй у вузкім значэньні слова, жывапісец. А ўжо калі паглыбляцца ў мастацкія тэрміны, дык ягоную прозу я б назваў літаратурным кубізмам.

## Дык што, Адам — найперш мастак?

**Алесь Марачкін:** Глобус — чалавек унівэрсальны, як у глыбіню так і ў шырыню. Усюдыісны, але ня ўсёедны. На маю думку, зь цягам часу будзе браца за пэндзаль як далей, дык больш. Тут прычынай будзе і вобразнасьць яго літаратурных герояў. Ну і шэсьць гадоў у мастацкай вучэльні не мінаюць бясьсьледна. Таму ён — наш.

Яго паэзія трапная, бо вобразная, маляўнічая, краявідная. Канечне, Глобус — дзіця гораду, але разам з тым моцна павязаны зямлёй.



ADAM-HLOBUS.LIVEJOURNAL.COM

Юбілей Глобус сустрэў у сваёй улюбёнай Барсэлёне.

## І не вясковы лірнік зусім, але і горад у яго нейкі адметны, надта адрозны ад папярэдніх вэрсіяў. І пэўна ж, няма пераемнасьці, скажам, з бацькам, Вячаславам Адамчыкам?

**Валянцін Акудовіч:** Ёсьць пераемнасьць, нават повязь, але ж глыбінная, не заўсёды бачная воку, можа быць. Кніга «Койданава», напрыклад, — разам зь яе адрознай эстэтыкай — усё ж працяг беларускай літаратурнай традыцыі. А так — Глобус хутчэй у эстытычнай апазыцыі ня толькі да бацькавай творчасьці, а да ўсяго пакаленьня бацькавых раўналетак. З сабой Глобус прынёс новы тып творцы, інаватара, творцы паліфанічнага.

## Дык хто такі Адам Глобус?

**Уладзімер Сьцяпан:** Ведаеце, думаў я над гэтым пытаньнем. І для мяне гэта больш не загадка, бо для сябе я ўсё разьвязаў. Вось спытайце людзей, хто такі Леанарда да Вінчы? Усе адкажуць па-рознаму: хто скажа — выпрабавальнік, хто — жывапісец або навуковец, але, пэўна, усе сыдуцца ў думцы — што ўсюды ён быў мастаком. Гэтаксама Глобус —мастак і ў літаратуры, і ў жывапісе, мастак эпатажу, мастак уласнага жыцьця. Адам даўно адкрыў гэты закон злучаных сасудаў у мастацтве. Умела эксплоатуючы тэму, дае нырца ў адной галіне, каб шчасьліва вынырнуць у іншай. А далей для адоранага справа тэхнікі: захаваньне прапорцыяў прыгажосьці, пасыл, правакацыя...

Гутарыў Павал Касьцюкевіч



АДАМ ГЛОБУС. «МЕНСКАЯ ПАНАРАМА №1»

# Падарожнік і дамасед

Адам Глобус.

У маёй душы адначасова жывуць дамасед і падарожнік...

Яшчэ ў дзяцінстве, як куды ехаць, я адразу пачынаў нэндзіцца. Ад адной толькі думкі пра хуткі пераезд мне рабілася млосна. Бо звычны свет пачынаў хістацца, а маё маленькае «я» нібыта мусіла падзяліцца і выйсьці з самога сябе. Перад паездкамі я сварыўся з бацькамі і плакаў.

Адзін з самых драматычных успамінаў майго дашкольнага дзяцінства зьнітаваны якраз з паездкаю з бабінага мястэчка Койданава ў бацькоўскі сталічны Менск. Скончыўся жнівень, трэба было падрыхтавацца да школы, у нашай гарадзкой кватэры мяне чакаў цёмна-блакітны форменны пінжак і партфель з букваром. Ехаць я не хацеў. Разумеючы ўсё глупства сваіх паводзінаў, я ўсё ж залез пад бабін ложак і ўчапіўся абедзьвюма рукамі за жалезную ножку. Выцягвалі мяне доўга, а выцягнуўшы, адлупцавалі скураным пасам, аб які дзед Бронік правіў сваю небясьпечную брытву. У цягніку пахла яблыкамі ды сьвежым ветрам чыгункі. Я глядзеў у акно і маўчаў. На станцыі Койданава засталося маё дзяцінства і маё непадзельнае маленькае «я», яно і зараз недзе там, пад бабіным ложкам трымаецца абедзьвюма рукамі за гладкую жалезную ножку.

У юнацтве я навучыўся маўчаць перад падарожжамі. Хваля няўтульнасьці накрывала мяне з галавою і я замаўкаў. Моўчкі пакаваў рэчы, моўчкі разьвітваўся са звыклым наваколлем, моўчкі ехаў…

У цябе можа скласьціся ўражаньне, што я не люблю падарожнічаць, але гэта зусім ня так. Вандраваць я люблю, але пакідаць сваё роднае месца цяжка, бо я ня з тых, хто сваё звычайнае існаваньне даводзіць да невыноснасьці, ня з тых, хто замест таго, каб навесьці ў доме парадак, усім расказвае, які гадкі і паганы ў яго дом. Я люблю ўсе дамы, дзе даводзілася жыць, люблю вуліцы, па якіх штодня хаджу, люблю свой бацькоўскі горад, сваё бабіна мястэчка і сваю дзедаву вёску. Але ёсьць адна рыса ў маім характары, якая падштурхоўвае мяне ў падарожжы. Маё «я» вельмі цікаўнае. Дзеля яго даводзілася навучыцца любіць транспарт. Я люблю цягнікі, машыны, аўтобусы, электрычкі, самалёты, караблі, катамараны і гелікоптэры, вакзалы, аўтобусныя і трамвайныя прыпынкі, аэрапорты і аэрадромы…

Верталёт я палюбіў зь першага погляду. Першы раз я ляцеў на верталёце з Адлера ў Сочы, глядзеў на горы і на мора, глядзеў на велічны Каўказ і зайздросьціў сам сабе. У падарожжах я сам сабе зайздрошчу: я-падарожнік выклікае павагу і зайздрасьць у я-дамаседа. Добра, што я-дамасед не агрэсіўны і ня помслівы. А вось я-падарожнік у мяне тэмпэрамэнтны, ён страшэнна ня любіць паўтораў. Ад бясконцых паўтораў мне і даводзіцца ўцякаць у падарожжы. Лячу ў Барсэлёну, Маскву, Рым, Амстэрдам, еду ў Вільню, Беласток, Магілёў, іду на ўскрайкі гораду. Новыя краявіды мяне клічуць, я ўсё спадзяюся на адкрыцьцё, на ўражаньне, на азарэньне…

Кожнае маё падарожжа сканчаецца прыкладна аднолькава: мне пачынае хацецца дамоў. Калі ў падарожжа мяне клічуць розныя галасы, дык дамоў мяне кліча адзін і той жа голас. Але ня з голасу пачынаецца працэс вяртаньня, а са смаку. За сьнеданкам ежа раптоўна страчвае ўсялякі смак, яшчэ за вячэраю ўсё было разнастайным — і горкім, і салодкім, і вострым, і салёным… А раніцаю зрабілася папярова-прэсным. Можна сыпаць перац і соль, але ад гэтага страва зробіцца няўежнай, а смаку не набудзе. Канечне я спрабаваў сябе падманваць, спрабаваў паабяцаць я-дамаседу, што ўсё будзе выдатна. Але абяцанкі-цацанкі не спрацоўвалі. Усё смачнае чакала мяне толькі дома.

Калі вяртаньне пачынаецца ў мяне зь ежы, дык падарожжа — са званка будзільніка. Званок, які я чую кожную раніцу, робіцца невыносным, яго паўторнае ціліцінканьне трываць няма аніякай моцы. Калі так, значыць, прыйшоў час выпраўляцца ў падарожжа.

Цяпер я задумаўся: каго я ў сабе люблю больш я-падарожніка ці я-дамаседа. Адказаць не магу, бо найбольш я ў сабе люблю мастака, які бачыць сальнічку і перачніцу на стале ў барсэлёнскай рэстарацыі і думае, як па вяртаньні дадому ён напіша натурморт «Соль і перац», як пакажа яго сваім старым сябрам і патлумачыць, што самае цікавае ў карціне ня тое, што расьсякае сьвядомасьць напапалам, а тое, што аб'ядноўвае соль і перац у адну непадзельную кампазыцыю.

# Рэдэле як рэдэле, абы добры мэйнэле

26 верасьня, за два дні да новага 5769-га году паводле габрэйскага календара, беларус **Аляксандар Астравух** прэзэнтаваў вялікі ідыш-беларускі слоўнік.

### Ін кладофке афтэр полке штэйт а банке міт варэньне

Няўтомны беларусіст Адам Мальдзіс ужо назваў гэты слоўнік «энцыкляпэдыяй жыцьця». Тут можна толькі дадаць — «абодвух народаў». Бо 928-старонкавы фаліянт, які акрамя артыкулаў, фразэалягізмаў і прымавак габрэйскага народу ўтрымлівае таксама беларускія прымаўкі і фразэмы, зьвязаныя з габрэямі. Да таго ж кідаецца ў вочы асаблівасьць слоўніка, якую спэцыялісты палічылі б заганай, — ідыскія словы напісаныя не габрэйскімі літарамі, а лацініцай. На думку складальніка, гэта спрасьціць неабазнанаму ў габрэйшчыне карыстальніку пошук такіх словаў, як «цымус» ці «хеўра», якія пратачыліся ў белмову, а таксама дапаможа ў пошуках выразаў, якія казалі людзі, што, маючы часам самае аддаленае дачыненьне да габрэйства, мелі самае непасрэднае да ідышу.

Слоўнік аздоблены малюнкамі і здымкамі беларускіх сынагог. Гэта першы ідыш-беларускі слоўнік з часоў невялічкага размоўніка, укладзенага Зьмітраком Бядулем у 1932 г.

### Рэстаўратары ідышу

Гісторыя слоўніка пачалася з глухіх сямідзясятых. Група мастакоў, што гуртавалася вакол выкладчыка Алега Хадыкі, сьпярша пастанавіла вярнуць у свой ужытак беларускую мову. Але роднай не задаволіліся. Палічыўшы карыстаньне роднай моваў само сабой зразумелым, мастакі, збольшага ўраджэнцы маленькіх мястэчак, зрабілі і другі крок у рэстаўрацыі сваёй Беларусі — пачалі вывучаць габрэйскі алефбэйс. Падчас экспэдыцыйных выправаў у розныя куткі, запісвалі габрэйскія песьні і выразы. «Ідыш дапамагаў захаваць здаровы глузд у той бязглузды час», — кажа Алесь Астравух.

«У скверыку за бюстам Дзяржынскага, месцы традыцыйнага «пыдэха», сватаўства, дзе вырашаўся лёс нежанатай габрэйскай моладзі, мы слухалі мову з вуснаў увішных зводніц і заклапочаных матак, — распавядае Мікола Залатуха. — Яшчэ мы хадзілі ў парк Чалюскінцаў, які ўпадабалі старыя габрэйскія пары. Там найбольшую асалоду мы мелі, калі, апісваючы адно аднаму смак крэплах (клёцак) і рогалах (рагалікаў), старыя пачыналі пераходзіць на сакавіты ідыш».




**Адна зь першых вэрсіяў гербу БССР, надпісы на якім зробленыя на чатырох дзяржаўных мовах, у тым ліку і на ідыш.**

ПАВАЛ КАСЬЦЮКЕВІЧ



**Аляксандар Астравух (зьлева) з Адамам Мальдзісам.**

### Леанід Ільліч Алейхэм

Сама прэзэнтацыя слоўніка прайшла вельмі па-сямейнаму: пры накрытым традыцыйнымі і не вельмі стравамі стале, з габрэйскімі і беларускімі песьнямі хорам, з пажаданьнямі добрага новага году.

Калі Мікола Залатуха, прачытаўшы на памяць нейкі ўрывак на ідыш, спытаў у прысутных пра аўтарства, пачуліся галасы: «Шолам Алейхэм», «Мэндэле Мойхер-Сфорым». Спадар Мікола пераможна абвёў позіркам прысутных і абвесьціў, што гэта быў урывак з кнігі Брэжнева «Малая зямля». Рэч у тым, што калі мастак заняўся сур'ёзным вывучэньнем ідышу, дык у мясцовай бібліятэцы была толькі адна патрэбная кніга — пераклад грандыёзнай брэжнеўскай апупеі. Але нічога не паробіш — жаданьне чытаць па-габрэйску перамагло, і мастак вучыў ідыш па сачыненьнях дарагога Леаніда Ільліча.

На прэзэнтацыі было трошкі сказана і пра росквіт ідышу ў Беларусі. Прыгадалі, як адначасова зь беларусізацыяй 20-х гадоў у БССР адбывалася й ідышызацыя. Цэлых дзесяць гадоў БССР была адзіным краем у сьвеце, дзе габрэйская мова была дзяржаўнай — разам зь беларускай, польскай і расейскай. У часы, калі позіркі беларусаў замежжа былі зьвернутыя на Менск, дзе былі зробленыя пэўныя крокі насустрач беларушчыне, габрэі ўсяго сьвету таксама захапляліся беларускай сталіцай. Бо ў Менску былі адчыненыя габрэйскія агульнаадукацыйныя школы, буйнымі накладамі выходзілі кнігі, нават дубляваліся на ідыш кінастужкі. У тыя гады тут тварылі таленавітыя Ізі Харык і Гірш Рэлес, і менавіта тут Майсей Кульбак напісаў шэдэўр габрэйскай літаратуры — раман пра даваенны Менск «Зельманцы».

Сёньня, выпалены канцлягерамі і расстраляны гулагамі, ідыш пакрысе вяртаецца ў Беларусь. Маем спадзевы, што сваю ролю тут адыграе і гэты слоўнік Алеся Астравуха, мастака-рэстаўратара, які аднаўляе ідыш.

**Павал Касьцюкевіч**

**P.S.** «Купіў за фуфцыкер — прадаў за ферцыкер, абы добры грош» (габрэйская прымаўка).

**P.P.S.** «Рэдэле як рэдэле, абы добры мэйнэле» — выйшла як выйшла, абы намер быў добры.

## СЬЦІСЛА

### Новы, інтэрактыўны сайт ARCHE

Яго інтэрнэт-адрас — arche.by. Сярод артыкулаў на першай паласе новага сайту: Віталь Сіліцкі «Гульня на падвышаных стаўках» — аб выбарах і гульнях вакол іх, Люкан Уэй «Сіла і слабасьць сучасных аўтарытарных рэжымаў». Андрэй Пачобут у артыкуле «Байкі для патрыётаў» рэцэнзуе кнігу Сяргея Ярша і Сяргея Горбіка, а Андранік Антанян разьбірае пераклады з Астрыд Ліндгрэн. Андрэй Дынько жорстка палемізуе зь Сьвятланай Алексіевіч у артыкуле «Драма, што мы ня рускія». Віншуем калегаў!

### Увесь Станкевіч

Упершыню ўся друкаваная спадчына айца Адама Станкевіча сабраная пад адной вокладкай. 1097-старонкавы том «З Богам да Беларусі», які пабачыў сьвет на гэтым тыдні, утрымлівае гістарычныя, публіцыстычныя, рэлігійныя, эпісталярныя творы ксяндза Адама, а таксама артыкулы аб ім. Кнігу, якая мае шанцы стаць самым аб'ёмным і грунтоўным беларускім выданьнем году, уклалі гісторыкі Андрэй Вашкевіч і Алесь Пашкевіч.

**Адам Станкевіч. З Богам да Беларусі: Збор твораў. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008**

### У Віцебску адкрылі мэмарыяльную дошку Васілю Быкаву

У Віцебску 25 верасьня адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцьця мэмарыяльнай дошкі народнаму пісьменьніку Беларусі Васілю Быкаву. Дошка размешчана на будынку дзіцячай мастацкай школы № 1 па вуліцы Суворава, 3. У гэтым доме раней знаходзілася мастацкая вучэльня, у якой у 1939—1940 гадах, на скульптурным аддзяленні вучыўся Быкаў.

### Беларускае кіно ад Нью-Ёрку да Ханты-Мансійску

Карціна Вольгі Мікалайчык «Сэрца за кратамі» (Вязьні сумленьня) і стужка Ўладзімера Коласа «Галерэя Ады» атрымалі прызы на фэстывалі тэлевізійнага кіно, што завершыўся 25 верасьня ў Ханты-Мансійску.

Фільм «Сэрца за кратамі» быў прысвечаны палітычным вязьням і атрымаў узнагароду, як найлепшая публіцыстычная стужка. Карціна Ўладзімера Коласа, што адзначаная прызам «Нацыянальны характар», распавядае пра настаўніцу Аду Райчонак, якая жыве ў вёсцы і арганізуе мастацкія плэнэры, прысвечаныя памяці сына.

Адначасова ў Нью-Ёрку праходзіў тыдзень расейскага кіно. Стужка «Розыгрыш», якую зьняў беларускі рэжысэр Андрэй Кудзіненка і ў якой галоўную ролю сыграў беларускі актор — была прадстаўленая сярод дзесяці найлепшых расейскіх фільмаў.

**Сямён Печанко, СМ, Андрэй Расінскі, паводле БелаПАН**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

### Цень дзевяностых

**Казакоў Валер. Цень Гобліна. Раман, апавяданьні, запісы. — Менск: «Кнігазбор», 2008—417ст. 1000 ас.**

У час, калі ўкладальнікі папярэдняга зборніка з усяе змогі імкнуцца ў Расею, ураджэнец Магілёўшчыны і знаны расейскі літаратар Валер Казакоў вяртаецца ў адваротным кірунку. Спадзяемся, не па смаленскай дарозе. Вяртаецца разам з чачэнамі, прадажнымі фээсбэшнікамі, сакавітымі маскоўскімі сакратаркамі, вельмі старым і хворым прэзыдэнтам, з галоўным героем, які мае красамоўнае імя Малюта Скураш, адным словам, з усімі дэкарацыямі расейскай палітычнай прозы канца дзевяностых. Вяртаецца ў спэцыяльна зробленай для беларускага чытача вокладцы, у аўтарызаваным перакладзе на беларускую.

Сярод белмоўных кніг — настолькі нязвыклая зьява, што аўтар, маем спадзевы, запачаткуе новы стыль — маскоўскія жахалкі для дарослых беларусаў.

Але ж не сярдуй, о аўтар, на зласьмешную крытыку! Усё, што мы хацелі сказаць, гучала насамрэч «Welcome home, спадару Валер!»

### Нясьпешныя экскурсіі ў часе

**Прамоўленае. Сяргей Харэўскі. — Вільня: Выдавецтва эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсітэту. 2008—148 с. 1000 ас.**

Культуроляг — экскурсавод. Экскурсавод, з здатнасьцю вадзіць экскурсіі па ўсіх музэях сьвету адначасова, з здатнасьцю вадзіць экскурсіі нават па музэях, якія поўняцца творамі, што не дажылі да нашых дзён.

Нашанівец і культуроляг Сяргей Харэўскі за памяркоўную цану зробіць вам экскурсію па ўласнай кнізе-музэі. Прыемна пабадзяцца па вулках паваеннага Менску і Вільні 1980-х ды паслухаць аповед Сяргея пра асмужаныя абсягі беларускае культуры. Ён вам усё раскажа і пакажа. У кумпаніі Харэўскага вас чакае сустрэча зь ценямі Азгура і Лангбарда, Малевіча і Рушчыца.

Асабліва адзначым артыкул «Мастакоўская літаратура»: досыць нечаканы ракурс — аповед пра літаратарскую дзейнасьць мастакоў. Падрабязна пра напісанае Маркам Шагалам і Язэпам Драздовічам.

**Лявон К**

## КАЛЯНДАР

### Кастрычнік

**1** — Канец Рамазану, мусульманскага трыццацідзённага паста.

**1** — Міжнародны дзень музыкі.

**5** — 550 гадоў таму (1458) нарадзіўся сьвяты Казімір, сын вялікага князя літоўскага Казіміра IV Ягайлавіча, патрон Гарадзенскага біскупства.

**9** — Дзень беларускай касманаўтыкі. 21 год таму (1977) у космас паляцеў першы беларус — Уладзімер Кавалёнак, родам зь вёскі Белае Крупскага раёну.

**10** — Ём Кіпур (Дзень выкупленьня грахоў) у юдэяў.

**14** — Пакроў у праваслаўных.

**15** — 175 гадоў таму (1833) памёр Міхал Клеафас Агінскі, дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, удзельнік паўстаньня 1794 г., аўтар паланэзу «Разьвітаньне з Радзімай».

**15** — у гэты дзень у1968 г. адбыўся першы выступ Led Zeppelin, легендарнага ангельскага рок-гурта, вельмі папулярнага ў СССР.

**20** — 4 гады таму (2004) забілі журналістку Вераніку Чаркасаву.

**25** — 25 гадоў таму (1983) памёр Мар'ян Пецюкевіч, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, этнограф.

**28** — у гэты дзень у 1523 г. выйшла з друку паэма Міколы Гусоўскага «Песьня пра зубра» — хрэстаматыйны твор беларускае літаратуры, напісаны на лаціне.

**31** — ірляндзка-амэрыканскае сьвята Хэлоўін.

**Склаў Лявон К**

# Выбары! Ці ёсьць яны?

**Прадстаўнікі ЦВК кажуць, што аніякіх парушэньняў зафіксавана не было.** Аляксандар Лукашэнка ўвогуле прэзэнтуе выбары, як шэдэўр — унікальны выпадак дэмакратызму. Мауляў, мы дзесьці нават парушаем уласны Выбарчы Кодэкс дзеля прыняцьця новага Парляманту краінамі Захаду. Так гэта ці не, нікому невядома. Канстатаваць можна толькі факты, зь якіх і складаюцца любыя дзеі. Не выключэньне й гэтыя Выбары-2008...

Каб зрабіць хаця б якія-колечы высновы, я зьвярнуўся да некалькіх чалавек па камэнтары...

* * *

Вольга, студэнтка дзённага аддзяленьня БДУІРу, жыве ў інтэрнаце й навучаецца на бюджэтнай аснове:

— Ня тое, што я зьбіралася галасаваць датэрмінова, але нас прымусова пагналі ставіць крыжык у выбарчых бюлетэнях.

— Такім чынам, казалі, каб ты ішла менавіта 25-га верасьня?

— Так! Яны казалі: «Ну, вам падабаецца жыць у інтэрнаце?»

— А кандыдата не называлі?

— Не! Нам проста, сказалі, каб мы ішлі галасаваць датэрмінова... І ўсе студэнты з нашага паверху хадзілі.

* * *

Мікалай, сябра партыі БХД. Дапамагаў Дзянісу Садоўскаму, кандыдату ад Масюкоўшчынскае акругі:

— Калі разносіў улёткі, заўважыў, што жанчыны часьцей за мужчынаў прыязна, ці хаця б бяз бачнай негатыўнасьці, іх прымалі. Мужыкі ж часта адмаўляліся. Я дзён пяць разносіў улёткі, і ніхто не паспрабаваў мне перашкодзіць. Нават міліцыя прыязна ставілася да нас, нам пазычылі посьпехаў на выбарах...

**Мікола Тамашэвіч, Менск**

# Прагаласаваў датэрмінова — атрымай заробак

**У калгасе «Яхімоўшчына» Маладэчанскага раёну вяскоўцы могуць атрымаць заробак толькі пасьля таго, калі датэрмінова прагаласуюць.** Прынёс паперку, што прагаласаваў — атрымай заробак. І людзі ідуць, бо ў няддзелю можна ж паехаць у горад, купіць чаго.

**Алена**

# Дыялёг з Шамякіным пад бел-чырвона-белым парасонам

**У маім штодзёньніку за 28 верасьня 1998 году, дзесяць гадоў таму, запісана:** «Тэлевізійная творчая экіпа здымала Івана Пятровіча Шамякіна. Яму трохі нездаровілася, але на здымкі пагадзіўся. Распавядаў пра свой раман «Сэрца на далоні» і для «Роднага слова» тое-сёе сказаў. Скардзіўся, што зьбядней: «Баюся на вуліцу выходзіць...» Але выйшаў, і тут я яго справакаваў. З мною быў бел-чырвона-белы парасон. Мы выйшлі на вуліцу. Здаецца, трохі імжэла, і мяне як нейкі нячысьцік падемаліў. Кажу:

— Іван Пятровіч! Гэты парасон яшчэ ні разу не распускаўся. Мне яго зусім нядаўна ахвяравалі на дзень нараджэньня. Дазвольце мне яго над Вашай галоўкай распусьціць.

І распусьціў. Іван Пятровіч падняў галоўку на распушчаны парасон і сказаў:

— Бел-чырвона-белы сьцяг я прызнаў, прызнаю. А вось герб «Пагоня» — не!

Гэта для мяне была нечаканка:

— Іван Пятровіч, — запярэчыў я. — Як Вы, народны пісьменьнік, можаце казаць: сьцяг прызнаецe, а герб не?!

— Дык гэта ж літоўскі герб, — вырвалася ў Івана Пятровіча.

Пачуўшы такое, я зразумеў: больш няма пра што гаварыць. Хаця я пра герб выказаў сваё меркаваньне. Прыкладам: я падзяляю ягоную думку пра герб толькі ў адным — можна было падумаць пра новы герб. Што да самой «Пагоні», я ніяк не магу зь ім пагадзіцца. Герб «Пагоня» можна было наканікуць за вайскоўцамі, за войскам. Што такое «Пагоня»? «Пагоня» — гэта сымбаль абароны Радзімы. То чым гэты сымбаль не падыходзіць для вайскоўца?

На гэтае маё меркаваньне Іван Пятровіч нічога не сказаў. Мо што ў сваім дзёньніку запісаў? А такі дзёньнік ён вёў. І наш дзень ён мо ўпісаў у свой нататнік. Наш тэлевізійны дзень. Цікава, што ён там запісаў?

**Уладзімер Содаль, Менск**

# Пабачыў Манаева і «Шляхту»

**Гэты год у культурным жыцьці нашай краіны асьвечаны вельмі важнай датай** — 200-годзьдзем з дня нараджэньня бацькі новай беларускай літаратуры, пачынальніка і кіраўніка першага беларускага тэатральнага калектыву Вінцэнта Якуба Дуніна-Марцінкевіча. Няёмка было б абмінуць магчымасьць наведаць прэм'еру новай пастаноўкі самага галоўнага яго тварэньня — фарсу-вадэвілю «Пінская шляхта»...

Зьнешне наш клясык у сваім творы болей за сто сорак гадоў назад імкнуўся давесьці людзям складаныя жыцьцёвыя праблемы, абмяжаванасьць, рыгіднасьць тэўнага слою грамадзтва, сатырычна паказаць нахабную сутнасьць, самадурства расейскага царызму. Дарэчы, навуковы кансультант гэтага спэктаклю Язэп Янушкевіч у адной з сваіх публікацый нават вызначыў кірунак п'есы як антыкаляніяльны. Ня кожны заўважае яшчэ адну адметную сэнсавую нагрузку «Пінскай шляхты». Марцінкевіч, як ніхто іншы — лічы, як да «Тутэйшых» Янкі Купалы, — яскрава паказаў, як можна лёгка маніпуляваць нашым братком-беларусам.

Дастаткова, гратэскава адцяняе аўтар, напусьціць сярдзітасьць (каб «адзін вус калом угору стаў») і падмацаваць гэта якім-небудзь «указам всемiласьцівейшага цара» ў брыдотнай слоўабладнай апраўе. Цяперашні разгляд, прачытаньне п'есы мае хутчэй сацыяльную акцэнтаванасьць, але роздумы, што выклікае твор, ня меней актуальныя і сёньня.

...Даўнавата не было ў мяне такой успышкі безнадзейнасьці, а затым — радасьці. Верасьнёўская нядзеля, палова 19-й гадзіны, Нацыянальны акадэмічны тэатар імя Янкі Купалы, прэм'ера. На століку ў касіркі ляжыць плякат, які абвяшчае пра адсутнасьць білетаў. Мы зь нейкай жанчынай падышлі да акенца бліжэй. Яна пытае, хутчэй ужо па інэрцыі, пра білет. Касірка: «Усе прадалі. Вось толькі адзін застаўся, нейкі чалавек толькі што адмовіўся». Не пасьпеў адумацца, як тут жа высунуўся з-за сьпіны нейкі прылізаны праныра: «Я куплю». Гэтак прыкра стала на самога сябе, на сваё «тармажэньне»... Пахадзіў-патуляўся ля тэатру. Зайшоў зноў — тая ж карціна. Але, о цуд: нейкая маладжавая жанчына прадае квіткі. Ёсьць білет! Хоць балькон, хоць збоку, але радасьць была напоўніцы, што мне той сыты партэр...

Ну і пачалося дзейства. Паклясычнаму сакавітае, народнае — ад Марцінкевіча і сучаснае, сынтэзавана-дынамічнае — ад рэжысёра-пастаноўшчыка Мікалая Пінігіна. Тут найперш напорыстая ньюМар'янка, «кія-сваты» нейкага японскага кштальту (у танцах), пісарчук-інкасатар, сьвятлафор-пацалункі з секунднымі хранамэтражам часу, ну а станавы прыстаў Кручкоў выдаваў і сапраўдную тэхналягічнасьць, і тужліва заціягваўся дэкрэт-малітвай, і бог ведае яшчэ што вырабляў...

...Пасьля спэктаклю гледачы сталі сьведкамі ўшанаваньня гэнага прыстава — заслужанага артыста Беларусі Віктара Манаева. На сцэну выходзілі адказныя спадары і спадарыні, яго калегі і паклоньнікі. Тэатру 50-гадовы юбіляр аддаў 28 гадоў, стварыў каля 60 сцэнічных вобразаў. А колькі прыгожых думак і яркіх, душэўчыпальных слоў прагучала ў гэты вечар...

Зноў вуліцы вячэрняга Менску. У такія мінуты думаецца асабліва выразна. Так, мусіць, звычайна і бывае: натхнёнае, іскрамётнае заранеў не сплянуеш, не разьлічыш. Тым болей каштоўныя такія імгненьні, крупінкі жыцьцёвыя для душы чалавечай...

**Сяргей Брадавы, Маладэчна**

# Сьвядомыя і несьвядомыя

**Прыпавесьць.**

У адной невялічкай краіне пачаліся вялікія праблемы са свабодай. Там сьпярша забаранілі незалежныя мэдыі, паездкі за мяжу і прыватную маёмасьць. Пасьля ліквідавалі піва і музыку. А праз некалькі гадоў усталяваньня дыктатуры было ўжо забаронена ўсё, альбо дакладней будзе сказаць — нічога не было дазволена. Адзіным аазісам свабоды для кожнага грамадзяніна заставалася ягоная ўласная галава. Людзі мелі шанец быць вольнымі выключна ў сваіх думках. І шмат хто зь незадаволеных нават такой магчымасьцю карыстаўся. Думалі сабе, што хацелі, уяўлялі, што толькі дазваляла фантазія, марылі пра што толькі марылася. Шмат хто захоўваў унутраную свабоду.

Краіна пра гэта здагадвалася і таму працягвала працу над канструкцыяй машыны для сканаваньня мазгоў. Праз гады экспэрымэнтаў машыну ўдалося вынайсьці і запусьціць. У паніцы перад перасьледам свабодалюбцы пачалі адвучваць сябе ад крамольнай практыкі. Але ж кінуць думаць ураз было немагчыма. Шматлікія рэпрэсіі закранулі тых, што працягвалі адчуваць унутраную свабоду. Машыны для сканаваньня працавалі бесьперастанку, выяўляючы апошніх недабіткаў дыктатуры.

Але чалавек — гэта надзвычайнае стварэньне, якое ўмее прыстасавацца да любога атачэньня нашмат лепш за хамэлеона. Людзі з часам навучыліся верыць у хлусьню. Нават калі яны чулі нешта хлусьлівае, то ўмелі так спрытна пераканаць сябе, што гэта праўда, што ніводная машына і блізка не магла здагадацца пра іхнае махлярства. Калі з трыбунаў крычалі, што краіна іхная самая свабодная, той, хто разумеў, што гэта лухта, адразу прывучаў сябе верыць, што гэта сьвятая праўда, і сам быў ужо гатовы даводзіць яе іншым. А рабіць гэта можна было толькі паверыўшы ў хлусьню.

Адзінай, бадай, прыемнасьцю была сьвядомасьць, што машыну думак можна падманyць. Цяпер людзі падзяляліся на сьвядомых і несьвядомых, аднак ні тыя ні другія нават не наважваліся пра гэта падумаць. Краіна была пераканаая, што чытае думкі сваіх грамадзянаў і была вельмі гэтым задаволеная; грамадзяне былі ня менш задаволеныя, бо ўсьведамлялі, што спрытна ашукваюць краіну. Незадаволеных у гэтай краіне ўжо не было.

**Віталь Воранаў, Познань**

# Даражэў газ

**Алегорыя.**

Даражэў газ. Не павольна — даляр за далярам, як для заходніх суседзяў, — не, адразу ўдвая, а потым яшчэ… А разам з набліжэньнем рынкавай цаны блізілася й дата выбараў. Ды як на ліха выбаршчык пайшоў пераборлівы — калі даражэюць камунальныя паслугі, то галасаваць ня хоча. Ці горш — хоча, ды ня так, як трэба.

Але, як ужо шматкроць было, паратунак прыйшоў адтуль, адкуль не чакалі.

За паўтара месяца да ацяпляльнага сэзону ўвалілі маразы. Выбаршчык, звыклы жыць паводле закону, ціха чакаў ацяпляльнага сэзону. Вядома, знаходзіліся й разумнікі, якія купілі электраацяпляльнікі ды палілі танную электрычнасьць. Але й яны не ўратаваліся ад вірусу, які прыйшоў у халодныя кватэры, да дзетак (год якіх якраз мінуў), пэнсіянэраў (якія за год да таго страцілі сваю каштоўнасьць як выбаршчыкі праз скасаваньне палёгкаў), настаўнікаў (палова якіх пахварэла праз новую рэформу), працаўнікоў, моладзі ды нават дактароў, што дужаліся павылечваць астатніх. Далей захварэлі дзяржаўныя служачыя (якія мусілі раз на месяц прымаць наведвальнікаў). А 15 кастрычніка зьлёг — апошнім — Кіраўнік Дзяржавы, які прымаў сьмяротна хворага Міністра Камунальных Паслугаў з рапартам аб пачатку ацяпляльнага сэзону.

У новы год краіна ўвайшла, гатовая да рынкавай цаны газу.

**Янка Багаслоў, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**



**Гарадзенскі дух неўміручы. Нават бізнэс-цэнтры (на фота) там нагадваюць Вітаўтаў замак.**

СЯМЁН ПЕЧАНКО

# Metallica ад Віталіка




Трымціце, фэны! Пасьля пяцігадовай ледавіковай сьпячкі брантазаўры сусьветнага року, амэрыканскі гурт Metallica, выпусьціў—зьнёс свой новы альбом Death Magnetic. Пра фэномэн гурту піша **Павал Касьцюкевіч**.

Як і было загадана вышэй, фэны, трымціце! Біцеся галавой аб сьценку ў прадчуваньні новай порцыі грымотна-бліскавічных рыфаў і зубакрышыльных выцылінгваньняў. Пайшла інфа, што дарослыя дзядзькі з Сан-Францыска дадуць такога фаеру, што хавайся ў бульбу. Іх адбойныя гітары лютавацьмуць стокроць натужлівей. Іх пупы будуць трэсьціся яшчэ агрэсіўней. Бо час прысьпеў, і ў фірмовых гарнілах ужо дыміцца распаленая да белага кружэлка, якая яшчэ да выпуску зрабілася мэга-супэр-дупэрплятынавай.

Куплю кружэлку і я. Настальгія, такое дзела... Напэўна, трохі счакаўшы, набуду дыск піратскага разьліву гэтага аццкага альбому. Да таго ж, кажуць, ужо ёсьць якасныя спасылкі ў сеціве.

Колькі ж прайшло, мінула, як і не было з часоў народнага гіту Nothing Else Matters. На пачатку 1990-х ён вярэдзіў танцпляцоўкі, якія толькі афармляліся ў дыскатэкі. З часоў, калі ў навакольлі сярод прасунутых рэчаў былі толькі перадача «Відзьма-нявідзьма» і MTVшная складанка па БТ.

Цяпер моладзь разьбеглася на некалькі моладзяў, распаўзлася, як прусакі, па завугольлях субкультураў: разьдзялілася на хлопчыкаў зь вялікімі шышкападобнымі навушнікамі і дзяўчынак з чупрынкамі колеру крумкачовага крыла.

А тады ўсе маладыя людзі слухалі баляды ад «Мэталікі». Нават гопнікі ў сініх спартовых касьцюмах «Пума» прыходзілі паслухаць. Стаялі скрай танцпляцоўкі, падазрона зіркаючы па баках і круцячы галовамі з Ы-падобнымі сківіцамі. Сапраўдныя нефармалы таксама трымаліся ўбаку і, какетліва папраўляючы хаер, на вушка сябру ганьбілі мэталічныя «медлякі». Яны, як вядома кожнаму патлатаму, уцягваюць любы нармальны гурт у бездань апапсеньня.

Проста агульны культурны код быў нейкі. «Энд насынг элс мэтэ-э-э-р-с...»

Потым пайшло ўсякае-рознае. За апошнія дзесяць гадоў хлопцы з Metallica зрабілі ўсё, каб зарабіць самім і даць зарабіць сваёй камандзе. Напрыклад, глямурны запіс сваіх гітоў з сымфанічным аркестрам, здымкі ў дакумэнтальным Some kind of monsters, дзе саліст, зьвераваты Джэймс Гэтфілд, гэтае ўвасабленьне рок-героя, плаксіва апавядаў пра свае псыхалягічныя праблемы.Усё адно як нейкі акулярыста-закамплексаваністы Вудзі Ален.

Больш за тое, абдурыўшы нас, цалкам апапсіўшыся і перажыўшы сваю эпоху, яны дазволілі сабе не памерці. Памятаю, нейкі час пасьля сьмерці саліста «Нірваны» ўсе злосна абгаворвалі ягоную жонку, Кортні Лаў. Маўляў, во сволач, жыве і жыве, і нічога ёй ня зробіцца, а павінна ж памерці з нашым любым Курцікам. Тады мы яшчэ ня ведалі, што цяжкія мэталісты — не буравесьнікі апакаліпсісу, а дробныя чорцікі ад рокэнролу.

Цяпер зьмяніліся і мы. Прыйшло-такі крэпкае разуменьне, што ўсе мы тут, на гэтай зямлі, — толькі людзі.

І ад такой бяскрылай банальнасьці ўжо і ня прыкра, нават вецер ня ў стане халадзіць былую рану, усё ўнармавалася. Таму пытаньне: «Чаму хлопцы з «Мэталікі», як і належыць сапраўдным рокерам, не скончылі жыцьцё самагубствам у трыццаць гадоў?» гучыць сёньня гэтаксама па-дурному, як дзетсадаўскае: «Хто дужэйшы, Шварцэнэгер ці Рэмба?»

Мы ж цяпер самі больш не перакручваем, як перакручвалі, саладжавую песьню «Бітлз» All you need is love («Усё, што нам трэба, — гэта каханьне») на свой капыл — All you need is all («Усё, што нам трэба, — гэта ўсё»). Мы вярнуліся да арыгіналу. Да сьвятарных «Жучкоў». І цяпер нам амаль усё — усё адно, мы толькі заварожана назіраем, як арнамэнт нашага шляху робіцца ўсё складанейшым, і ніхто-ніхто нічым не расчараваны — ужо няма нагоды, няма часу, мы цяпер нават не заўсёды сочым за чаўнаком — і амаль не цікавімся, чым для нас скончыцца чарговы пасаж гэтай хуткай чырвонай ніткі: ці то жыцьцём, ці то сьмерцю — бо ведаем, што ніхто ні ад чаго не застрахаваны, і таму, глянуўшы на новую вокладку альбому «Мэталікі», адразу ня можам сьцяміць, гэта дамавіна ці гэта вагіна?

### Яшчэ раз пра клятыя дзевяностыя

Тады нас кармілі культурным сэканд-хэндам. Нічога — мы выраслі і так. It's OK now. Елі націшне без карэньня і гэтак сталелі. Слухалі ўсе гіты са спазьненьнем у пяць—дзесяць гадоў. Ня ведалі, што акрамя «Насынгу», у «Мэталікі» ў запасе як мінімум дваццаць значна лепшых песьняў. Ня чулі таксама, што найвыбітнейшыя альбомы «Мэталікі» засталіся ў васьмідзясятых — «Гаспадар марыянэтак» і «Правасудзьдзе для ўсіх...» Ні тэкстаў, ні культурнага кантэксту не разумелі. У гэтых песьнях нам торкала ад чагосьці іншага.

Цэлых пяць гадоў, мусіць, да 1995-га, мы былі як нявыкарыстаныя снарады. Ужо потым, бліжэй да канца 1990-х, панеслася па новай: нас запхнулі, перазарадзілі, перадзёрнулі, перапраграмавалі.

Але тады ім было не да нас. Усе іх сілы ішлі на тое, каб карміць нас. Школьныя настаўнікі езьдзілі па тавар у Польшчу. Бацькі падлічвалі ў даляравым эквіваленце маральныя страты ад развалу Савецкага Саюзу. Мы хапатліва сілкаваліся праз прапхнуты ў фортку шлянг ад пральнай машыны і бегма вярталіся ў свае сутарэньні. З усіх дарослых на нас зьвяртаў увагу толькі гандляр, якія прадаваў на «Дынама» майкі з надпісамі Guns'n'Roses і нашыўкі «Fuck you». Нам было па кайфу.

Ня ведаю, як мы ўсе збольшага засталіся жывыя. Адна з прычын, пэўна, што ў Беларусі тады не было наркотыкаў. Ніякіх.




«Мэталіка» была па кайфу. Правей ад саладжавых «Скарпоў» і «Бон Джові». Лявей ад надта, ня ў меру ўжо прасунутых «Нірвана» і «Пэрл Джэм». «Мэталіка» была як трэба. Ёсьць культурныя прадукты, такія як трэба. «Народны альбом», да прыкладу, кнігі Альгерда Бахарэвіча. Дзе ўсё на месцы, дзе ўсё па зубах. І, наагул кажучы, цяпер, азіраючыся на вяхі майго культурнага сталеньня, заўважаю з зьдзіўленьнем, што ўсё было як трэба. А наагул-наагул кажучы, падчас падлетკаваньня ўсё-ўсё было як трэба. Гэтай пазыцыі я навучыўся ў іншага кайфовага амэрыканца — Курта Вонэгута.

Не скажу, што цяпер таксама ўсё як трэба. Калі я бачу хлопчыкаў-першаклясьнікаў у ахайненькіх пінжачках, мне робіцца млосна. Кар'ера — добрая рэч, але ня ў шэсьць жа гадоў! Я рэагую гэтак дзякуючы атрутным павевам дзевяностых і тагачаснай шчасьлівай адсутнасьці настаўнікаў жыцьця. Дастатковай колькасьці волі, якую цяпер завуць свабода. А песьні «Мэталікі» — афіцыйныя гімны гэтага часу. Як і належыць сапраўдным гімнам — банальныя, яжджалыя шляхі, агульныя месцы, але калі іх чуеш, дык яны заўсёды трапна колюць у сэрца. У мяне дома запісаў «Мэталікі» няма, але хто захоўвае запісы гімнаў дома?

### Дзякуючы «Мэталіцы»:

1. Я як сьлед вывучыў ангельскую мову (меў звычку перакладаць тэксты песьняў са слоўнікам).
2. Я пачаў слухаць іншую добрую музыку, не абавязкова цяжкую ці нават сучасную, але такую, якая даволі часта мацавала мяне ў ліхую часіну.
3. Я пачаў граць на гітары і гэта выратавала мне жыцьцё. Аднойчы, калі ў забягалаўку, дзе я працаваў, прыехалі знаёмцы і паклікалі мяне паталагаць, я адмовіўся — мне хацелася як мага хутчэй зарабіць на даражэзную гітару. У той вечар знаёмцы разьбіліся. Дарэчы, гітарыст зь мяне ня выйшаў.
4. У мяне было вельмі рамантычнае піянэрлягернае каханьне. Яна выявілася фанаткай гурта, і таму мне было проста размаўляць зь ёй у першыя, самыя гнятлівыя, хвіліны знаёмства.
5. Дарэчы, дзякуючы гэтай «жалезнай» тэме, я даволі часта знаходжу агульную мову з шмат якімі незнаёмымі людзьмі. Дастаткова сказаць чатыры чароўныя склады і вочы суразмоўцы летуценна мружацца, бо, відаць, шмат хто зь іх мае некалькі сваіх уласных пунктаў «дзякуючы «Мэталіцы».

...

6. А болей? Што ж там болей чакаць ад песьняра?

# Вялікі князь Сьцяпан

27 верасьня споўнілася 475 гадоў ад нараджэньня Сьцяпана Батуры — вялікага князя літоўскага і польскага караля, аднаго з найлепшых кіраўнікоў Беларусі за ўсю гісторыю.




Граматы, падпісаныя яго энэргічным, размашыстым Stephanus Rex, можна пабачыць у гістарычным музэі ў Вільні. Варта падзякаваць гэтаму трансільванцу за Полацак. Невядома, ці быў бы такі горад у складзе Беларусі, і ці быў бы такі горад наагул, не адбі яго Батура ў Івана Жахлівага. Дзякуючы яму набыла непаўторная сваё аблічча і Горадня. Яна была каралеўскім горадам за Батурам. Дый Віленскі ўнівэрсытэт, зь якога выйшла столькі слынных асобаў нашай гісторыі, быў заснаваны ў 1579 г. прывілеем вялікага князя Сьцяпана.

Труна Батуры ў падвалах Кракаўскага замку засыпаная кветкамі.

**ІН**

# Каляндар «Родны край» аднавіў выхад




У 2007 г. выдавецтва «Беларусь» адмовілася ад друку календара з эканамічных прычынаў. Тады галоўны рэдактар выдавецтва Якаў Аляксейчык паведаміў, што «Родны край» кепска прадаецца. У 2006 г. было надрукавана ўсяго 7000 асобнікаў, зь якіх не прадалі 1500.

Тэлефанаваньні ў кнігарні высьветлілі, што каляндар карыстаецца попытам ў пакупнікоў. У Мінінфармацыі зьвярнуўся старшыня «Таварыства беларускай мовы» Алег Трусаў. Там яму патлумачылі, што, улічваючы пэўную патрэбу насельніцтва ў беларускамоўных календарах, выдавецтву «Беларусь» будзе даручана аднавіць выпуск адрыўнога календара «Родны край».

І вось сёлета ў кнігарнях Менску зьявіўся каляндар на 2009 г. Яго наклад 7000 асобнікаў. Выдадзены ён на замову Мінінфармацыі, якое дапамагло й грашыма. Купіць яго можна ў любой кнігарні. Цана проста сьмешная — 2300 руб.

**СП**

# Забытая сталіца

Рэпартаж **Сяргея Харэўскага** з Чарэі.

Ёсьць, ёсьць у нашай краіне яшчэ таямніцы, містычныя мясьціны, што нібы вэлюмам ахутвае нязнанасьць, недасяжнасьць ці забытасьць… Адно з такіх месцаў — Чарэя, былая сталіца Чарэйскага княства, родавае гняздо Сапегаў, котлішча Мілашаў, цэнтар Чарэйскага раёну… Гэтае легендарнае места знаходзіцца, дарэчы, куды бліжэй ад Менску, чым тэта можна сабе ўявіць, чытаючы пра яго бурлівую й парадаксальную гісторыю. Простая маскоўская шаша без затрымкі даймчыць да Бабра. А там адзін толькі паварот улева і… па гарбатым асфальце, у лапіках бітуму і каровіных ляпёхах, праз якіх пятнаццаць хвілінаў можна апынуцца сярод курганоў на беразе разьлеглага Чарэйскага возера. Ужо на тым паввароце раптоўна сьціхаюць гукі нашага часу. А тут, сярод неабсяжных далягляду, сярод смарагдавых лугоў і сінечы вады, цішыня здаецца нейкім падступным трукам. Бо няма як даць веры, што некалі тут вiравала людзкое жыцьцё.

Чарэйскае княства было добра вядомае з XIV ст. У часы грамадзянскае вайны ў ВКЛ 1432—1435 гг., стары чарэйскі князь Міхал Пяструцкі быў забіты Сьвідрыгайлам. Апанэнт Сьвідрыгайлы, вялікі князь Жыгімонт, за вернасьць Пяструцкіх падараваў Чарэйскаму княству багата новых уладаньняў. У 1454 г. япіскап смаленскі Місаіл заснаваў тут, на возеры Галаўль, славуты Чарэйскі манастыр. Асаблівы росквіт Чарэі прыпаў, аднак, на эпоху Сапегаў, якія хацелі пераўтварыць яе ў сталіцу свайго роду, кшталтам Нясьвіжу Радзівілаў…

Закінутыя, з праваленымі дахамі калгасныя будынкі, пустыя дамы, вялікі пусты дзіцячы садок, не стары, з сылікатнае цэглы, ажно на два паверхі, пустуюць нейкія бэтонныя буданы немаведамага ўжо прызначэньня… Дыхтоўны вялікі будынак школы сталінскіх часоў таксама пусты… Чуваць адно пераховы лісьця ў зьдзічэлых прысадах і на закінутых могілках.



Парэшткі фамільнага склепу роду Мілашаў.

«Хадземце, я павяду вас у край дзівосаў, сутоньня, імглы і ціхіх шэптаў… Вось мы й тут, на ўскраінах польскіх земляў, ужо, пэўна, паўночных, але яшчэ закаханых у колеры.

Адзін узмах крыла — і мы паляцім над краінай, дзе ўсе рэчы пазначаныя прыгаслым колерам успамінаў. Нас агортвае пах гарлачыкаў, імшаная лясная смуга. Млявае бледнае неба задуменнага краю, што адкрываецца перад намі, хавае ў сабе ўсю сьвежасьць позірку старавечных плямёнаў». Гэтак пісаў пра свой родны кут Оскар Мілаш, які нарадзіўся ў дзедавым фальварку, у Чарэі, на ўскрайку старажытнага места, слава якога некалі сягала самых далёкіх куткоў Рэчы Паспалітае. Асьцярожна ступаючы ў зарасьцях някошанае травы, п'ючы водар безьлічы стракатых кветак і перасьпелых садоў, цяжка пазбыцца адчуваньня, што Оскар Мілаш сам насурочыў такі безбалесны скон сваёй Бацькаўшчыне… Ці мо, наадварот, ён быў празорцам?

### Чарэя Мілашаў

Як ні дзіўна, у Чарэі пра Мілашаў ведаюць калі ня ўсё, дык амаль усе. Простыя людзі са смакам перадаюць дзіўную ў сваёй цьвёрдай дакладнасьці апакрыфічную лічбу — 126. Столькі, маўляў, у Мілашаў было гатункаў бэзу. А вось супрацоўніцы бібліятэкі й клюбу выдатна абазнаныя ў акалічнасьцях біяграфіі свайго славутага земляка — францускага паэта. Нават апавядаюць такую трапную дэталь, што ён, калі прыяжджаў сюды з Францыі дваццацігадовым дзецюком, то скакаў вярхом на кані, вось *да гэтага месца...*

Яшчэ ў Чарэі засталіся даўжэзныя ліпавыя прысады, што вядуць ад краю мястэчка, па грэбені пагоркаў, на высокую гару, дзе, як кажуць чарэйцы, стаяла *альтанка Мілашаў...*

Што праўда, від ад альтанкі раскрываецца магутны. Адсюль відаць амаль уся Чарэя, усё возера й далёкія вёскі за ім. Так далёка… Пад гарою — купка курганоў, дзе бярозы зьмянілі крыжы, на старых каталіцкіх могілках, дзе й да сёньня стаіць пахавальня Мілашаў. Зруйнаваная й даўно разрабаваная… Сярод шалу дзікае травы, нібы пісягі вогненнае лявы, зіхцяць зарасьці рудбэкіі. Лішне казаць, людзі кажуць — *ад Мілашаў яшчэ...*

За часоў Мілашаў Чарэя была хоць і прыгожым, але ўжо проста мястэчкам на сумежжы губэрняў, узбоч усіх вартых увагі шляхоў. Старасьвецкія храмы, ружанец таямнічых курганоў над зіхоткім бяздоньнем азёраў і на доўгія мілі вакол нерухомага забыцьця. Тутэйшыя Мілашы былі буйнымі абшарнікамі, бо ім належала ў ваколіцах 30 тысячаў гектараў зямлі. Хоць слыннымі іх зрабіла не багацьце, а, перадусім, незвычайна моцныя характары й арыгінальныя ўчынкі. Гэтак дзед Оскара, слухаючыся адно свайго сэрца, вывез таемна з Італіі сабе жонку — Наталі Тасістра, з роду гэнуэскіх патрыцыяў. А бацька Оскара, Уладыслаў, таксама зьдзівіў публіку, пабраўшыся шлюбам з габрэйкаю Марыяй Разаліяй Разэнталь, дачкою настаўніка ідышу з Варшавы… Вось у выніку гэткіх сямейных акалічнасьцяў, 28 траўня 1877 году й нарадзіўся ў прадзедавым фальварку Оскар Вацлаў Мілаш, гербу Любіч. А ў 1889 г. сям'я пераехала ў Парыж, дзе й было яму наканавана жыць і тварыць да канца дзён. Ён атрымаў такую адукацыю, якую хацеў, — стаў знаным у Парыжы арыенталістам, адмысловцам у мовах і верах Усходу. Тут, ужо праз дзесяць гадоў выходзіць ягоная першая кніжка вершаў Le Poeme des Decadences.

У 1904 годзе, пасьля сьмерці бацькі, ён вяртаецца ў Чарэю, дзе мусова займаецца вялікай гаспадаркаю. Але пры тым знаходзіць час і для далёкіх падарожжаў — у Ангельшчыну, у Расею, у Афрыку, у Літву… Тут у ягоныя рукі трапляе першая легальная газэта па-літоўску Vilniaus žinios. Хоць пісаць па-літоўску Мілаш не навучыўся, але менавіта ў гэты час ён раптоўна становіцца prince lituanien, *літоўскім князем,* апантаным усім, што тычыцца Літвы. І хоць літоўскае мовы ён так і ня вывучыў, але ў 1918 годзе ўжо браў удзел у паседжаньнях Лігі Нацыяў як прадстаўнік… літоўскае дэлегацыі.

А каб у ягоныя рукі патрапіла ў свой час «Наша Ніва»?

### Чарэя Сапегаў

На месцы колішняй сядзібы Мілашаў сёньня стаіць школа, збудаваная па вайне. Ад былога панскага фальварку пасярод школьнага двара застаўся склеп — ляднік.



Гіганцкая Траецкая царква Сапегаў дамінуе над навакольлем.



Закінутая чарэйская школа стаіць на падмурках сядзібы Мілашаў.

Уваход у яго адрамантаваны, і ўсё вакол дагледжана. Аказваецца, у вайну тут была нямецкая катоўня. За савецкім часам уваход сюды каравуліла піянэрская варта… Сёньня тубыльцы гавораць пра гэта з горкай усьмешкаю. Вялікі будынак школы пустуе.

Але гэта хоць нейкі знак…

А вось адгадаць, дзе і што было ў Чарэі за часам Сапегаў, — куды складаней. З XVI і да канца XVIII ст. уладаньне Чарэя мела статус графства й належала князям Сапегам. Яшчэ Багдан Сапега пабудаваў тут свой замак на старым гарадзішчы. А калі ў 1584 г. Леў Сапега атрымаў абраз Сьвятога Міхаіла ў падарунак ад маскоўскага цара Івана Васілевіча (а той, у сваю чаргу, атрымаў яго ў 1510 г. з Канстантынопалю ад патрыярха Васіля), то ён і стаў галоўнай сьвятыняю Чарэі. Леў Сапега аднавіў старажытны Чарэйскі манастыр, а ў 1599 г. на востраве возера Галаўль пабудаваў Траецкую царкву, першы ўніяцкі храм у краіне. Калі ў 1650 г. расейцы падпалілі Чарэю, то цудоўны абраз з усімі аздобамі дзівосным чынам быў уратаваны і зьмешчаны ў Траецкай царкве. Яе руіны да нашых дзён пануюць над разлогамі возера… У 1604 годзе на загад князя тутака ж быў пабудаваны й вялікі касьцёл Сьвятога Міхаіла, дзе цудоўны абраз зьберагаўся да самае бальшавіцкае рэвалюцыі. Але далей сьлед старажытнай сьвятыні губляецца.

На месцы колісь вялізарнага касьцёла — сёньня пустка, не засталося нават хоць якіх акопаў. Адзінае месца ў мястэчку, дзе асфальт ляжыць роўна. На касьцелішчы сёньня стаіць праваслаўны крыж… Каталікоў у Чарэі, як людзі кажуць, — чатыры сям'і. І езьдзяць у новы касьцёл у Навалукам'і.

Людзі паказваюць, дзе якія дамы змураваныя з старадаўняе касьцельнае цэглы. Дамы тыя, нязграбныя й лядашчыя, таксама сёньня пустыя… Сапегава спадчына. А вось старажытную цэглу, кафлю, дахоўку, знаходзяць па ўсёй Чарэі, дзе не капані… Розныя людзі шматкроць шкадуюць, што няма хоць якога музэю, ды хоць бы ў закінутай школе, бо надта ж багата тут усяго знаходзяць…

Старажытную царкву Міхала Архангела, што цудам ацалела тут, марна шукаць у Сьпісе гісторыка-культурных каштоўнасьцяў ці ў адмысловых даведніках. Яе тамака няма. Як ні намагаўся цяперашні сьвятар, айцец Аляксей, дабіцца статусу для храму — усё марна. Чынавенства ня хоча браць сабе за клопат ахову ўнікальнага помніка, аднаго з найпершых у стылі барока ў нашым краі.

Больш як паўстагодзьдзя сьвятыня выкарыстоўвалася пад калгасныя патрэбы, а сёньня хіба толькі самому праваслаўнаму сьвятару й купцы вернікаў яна й патрэбная.

Літаральна каля царквы — малітоўны дом хрысьціянаў веры Эвангельскай. Дагледжаны, але пусты. Ніхто толкам ня здолеў патлумачыць, ці зьбіраецца тут хто. Настаўнікі, праўда, настроеныя да гэтых пяцідзясятнікаў лагодна. Маўляў, яны займаліся дзецьмі зь цяжкіх сем'яў. А вось цяпер не відаць каля гэтае малельні нікога.

Айцец Аляксей у пратэстантах канкурэнтаў ня бачыць. Маўляў, што зробіш, калі людзі наогул ні ў які храм ня ходзяць. У Чарэі, паводле апошняга перапісу, жыве 537 чалавек. А ў царкву, што з гэткімі цяжкасьцямі аднаўляе сьвятар, ходзіць ня болей як пару дзясяткаў. Толькі на Вялікдзень 2000 г. тут была адслужаная першая літургія.

Айцец Аляксей сам з Параф'янава. Ён ведае, як могуць супольна жыць людзі розных канфэсіяў. І зь цеплынёю згадвае старога параф'янаўскага ксяндза Рышарда, які ведаў асабіста кожнага са сваіх парафіянаў, заходзіў у кожны дом. Гледзячы на ягоную самаадданую працу й захацеў стаць сьвятаром… Стаў. Але гэты прыгожы азёрны край — пакуль няўдзячны цалік задзірванелых душаў, зусім пакуль непадобны на родную Докшыччыну. І зразумець, чаму дзяржава не цікавіцца гэткім выдатным помнікам, храмам 1604 году — сапраўды цяжка… Зрэшты, на супрацьлеглым беразе пакуль стаяць рэшты белае Траецкае царквы, яшчэ старэйшае. Яны нібы ахоўваюцца дзяржаваю, але…



**«Цюнінгаваны» храм XVI стагодзьдзя, дагэтуль ня ўзяты пад ахову дзяржавы.**

## Чарэйская поўня

Як ходзіш па Чарэі, то цяжка пазбыцца адчуваньня, што за табою нехта сочыць. Ходзіш па цнатлівых лугах, па старых падворках, караскаесься на курган — нібы нікога нідзе не відно, але за табою ўсё ж цікуе нехта. Пра гэта стала зразумела ў краме, дзе людзі з падозраньнем пыталіся, чаго прыехаў. А адзін важнага віду пан з Барысава, які купіў тут сядзібу пад дачку над возерам, не паленаваўся выйсьці на выган, каб пераканацца, што ягоную ўласнасьць не фатаграфуюць.

У 1905 годзе ў Чарэі, акурат тады, як тут гаспадарыў Оскар Мілаш, былі дзьве праваслаўныя царквы (ад адной гэтаксама не засталося і знаку), касьцёл, тры капліцы, царкоўна-прыходзкая школа, паштова-тэлеграфнае аддзяленьне, а апроч таго сынагога, тры жыдоўскія малельні і габрэйская рэлігійная школа… Соннае правінцыйнае жыцьцё, па-свойму багатае, па-свойму мілае…

Гірш Рэлес, успамінаючы родныя мясьціны, пісаў: «Куды б чарэйская жанчына ці дзяўчына ні прыехала, ніхто не называў яе сапраўдным іменем, а менавалі Чарэйскай Поўняю. Мянушку гэтую яны атрымалі ня толькі таму, што бальшыня зь іх былі круглатварыя й невысокія. Мястэчка Чарэя знаходзіцца за дваццаць кілямэтраў ад Чашнікаў. Аднойчы чарэйскую дзяўчыну туды прывезьлі, пазнаёмілі з маладзёнамі. У суботні вечар яна з хеўраю моладзі хадзіла на шпацыр. Толькі выйшлі з двара, а яна падняла галаву й з подзівам прамовіла:

— Глядзіце, глядзіце! Тут нашая чарэйская поўня. Па ўсіх прыкметах я яе пазнаю. Як яна сюды патрапіла? Дзіўлюся…

Хлопцы зь дзяўчатамі з усьмешкаю пераглянуліся…

З таго часу пачалі яе клікаць Чарэйскай Поўняю. Але гэтая мянушка не зашкодзіла ёй выйсьці замуж за чашніцкага хлапца.

Ад таго, дзе б ні зьяўлялася чарэйская жанчына, іх завуць Чарэйскаю Поўняю…».

Але праминула няшмат часу, і Чарэю, зь яе спракаветнай гісторыяй, з таямніцамі й байкамі, выпаліў час. Ад даваеннае Чарэі, што была раённым цэнтрам, не засталося нават фатаздымкаў…

А 5 сакавіка 1942 г. на ускрайку Чарэі, акурат за Мілашавымі прысадамі, немцы забілі 800 тутэйшых габрэяў. Калі хто будзе ў Чарэі — паспрабуйце ў хмызьняку знайсьці гэтае вусьцішнае месца, куды не вядзе нават сьцяжына…

Затое на старажытныя жыдоўскія могілкі, цалкам ацалелыя, людзі езьдзяць. Каб выкінуць сьмецьце. Проста так і кідаюць на чужыя магілы свой хлуд. Відавочна, гэта пачалося нядаўна. Гэта зусім не азначае, што ў Чарэі даглядаюць якія іншыя могілкі. Гэтаксама нядаўна паразьбівалі, павывarochвалі крыжы й надмагільлі на старадаўніх каталіцкіх могілках. А поруч — зьдзічэлыя новыя могілкі, на якія не прайсьці праз траву й хлуд.

Тутэйшая кабета апавядае, што як ні намагалася намовіць людзей на якую талаку, хоць на Радуніцу, хоць на Дзяды — марна.

Айцец Аляксей на разьвітаньне са скрухаю зьвярнуў увагу на адну тутэйшую акалічнасьць — храмы Чарэі руйнавалі ня немцы і нават не бальшавікі, а… самі людзі. Разьбіралі ня проста так, а думалі, на лепшае жыцьцё сабе цэглу цягнуць. Хто на хлеў, хто на печ. Не атрымалася жыцьця лепшага…

І поўня сьвеціць на ўсіх пароўну.



**Старажытную царкву Міхала Архангела айцец Аляксей парадкуе як можа.**

**Фота Алеся Матафонава**

# Ад чаго заікаюцца білінгвы

Дзьвюхмоўе можа быць адной з прычынаў, якія правакуюць заіканьне. Затое дзьвюхмоўныя маюць лепшыя матэматычныя, аналітычныя здольнасьці, лягчэй думаюць і хутчэй рэагуюць, маюць у старасьці больш ураўнаважаны характар ды ясьнейшы розум.

Брытанскія спэцыялісты вывучылі гісторыі хвароб 317 дзяцей, якія заікаюцца, і прыйшлі да высновы, што адной з прычынаў, якія правакуюць заіканьне, можа быць дзьвюхмоўе.

Заіканьне — хвароба, нэйрафізіялягічныя прычыны якой да канца не вядомыя. Высьветлена, што яна выступае ў 4% дзяцей, прыкладна ў траціны зь іх захоўваецца на ўсё жыцьцё. У хлопчыкаў выступае намнога часьцей, чым у дзяўчатак. Дакладных мэтадаў лекаваньня ня мае, але ў большасьці выпадкаў праходзіць. У яго ўзьнікненьні адыгрывае ролю генэтычная схільнасьць. Але ўзьнікае яна толькі калі накладаецца з псыхалягічнымі траўмамі, нэрвовымі перагрузкамі. Тыповы выпадак — калі дзіця пачынае заікацца, напрыклад, пасьля таго як у сям'і зьяўляецца другое дзіця, якое пачынае карыстацца цацкамі першага.

Псыхолягі зь Лёнданскага ўнівэрсытэцкага каледжу высьветлілі, што чыньнікам рызыкі ўзьнікненьня заіканьня ў дзіцяці да 5 гадоў можа быць і білінгвізм. Сярод дасьледаваных імі пацыентаў амаль 22% размаўляюць дома на адной мове, а ў школе — на іншай.

Больш за тое, дасьледчыкі сьцьвярджаюць, што дзецям-білінгвам цяжэй пераадольваць як заіканьне, так і іншыя лягапэдычныя недахопы.

У зьвязку з гэтым ангельскія навукоўцы параілі сьпярша навучыць дзіця роднай мове, і толькі пасьля 5-гадовага веку пачынаць вучыць яго мове другой. Тым больш што здольнасьць да хутчэйшага засваеньня моваў застаецца ў дзяцей да 11 гадоў.

Гэтае дасьледаваньне ўмацавала ў сваёй праваце прыхільнікаў аднамоўнага выхаваньня дзіцяці. Яны цьвердзяць, што толькі адна мова можа сфармаваць у малечы цэласнае ды гарманічнае ўспрыманьне сьвету. Раньні ж білінгвізм, на іхную думку, стварае ў галаве дзіцяці і моўную, і сьветапоглядную трасянку. І на гэтым пералік мінусаў дзьвюхмоўнага выхаваньня не вычэрпваецца.

Навукова засьведчана, што дзеці-білінгвы пазьней авалодваюць сьпярша маўленьнем, а пасьля пісьмовай мовай, слоўны запас у іх на кожнай з моваў бяднейшы, чым у аднамоўных аднагодак, хоць усяго словаў яны ведаюць болей. Нарэшце, нярэдкія праблемы з засваеньнем граматычнага ладу адной з моваў. Такія дзеці гавораць самастворанай трасянкай, выбіраючы ў кожнай з моваў лацьвейшыя для сябе словы ды канструкцыі — да пяці гадоў гэта лічыцца нармальным, але спакуса ўточваць у маўленьне безэквівалентныя або карацейшыя канструкцыі зь іншай мовы застаецца зь білінгвамі на ўсё жыцьцё. Праўда, толькі ў тым выпадку, калі, навучыўшыся разрозьніваць мовы, малады чалавек ня схоча адмовіцца ад аднае зь іх — ці то з прычыны, як яму здаецца, «слабейшасьці», ці то таўра «варожасьці» да адной з моваў у грамадзтве. У такіх выпадках навукоўцы фіксуюць надзвычай імклівае адміраньне дасканала засвоенай дагэтуль мовы.

Зрэшты, неабходна заўважыць, што «лягапэдычны аргумэнт», кагадзе падтрыманы ангельскімі навукоўцамі, знаёмы дасьледчыкам даўно. І некаторыя сьцьвярджаюць, што «лішняя» мова ня мае ніякага простага дачыненьня да заіканьня дзіцяці. Справа ў тым, заўважаюць яны, што нярэдка ў сем'ях, дзе выхоўваецца такое дзіця, пануе нездаровая атмасфэра. Калі гэта эмігранты ці ўцекачы, дзіцяці даводзіцца зазнаваць стрэс і сьлёзы дзеля сацыяльных прычынаў, пачуцьця чужынскасьці, матэрыяльнай незабясьпечанасьці.

Калі ў сям'і строгія норавы й недахоп пэдагагічнага досьведу, ад дзіцяці могуць патрабаваць датрыманьня сваёй мовы, чаго б гэта ні каштавала: упікаць за кожнае «няправільнае» слова, перабіваць нават у часе шчырай размовы, строга патрабаваць, каб малое размаўляла на сваёй мове, хоць яно яшчэ тыя мовы можа не адрозьніваць.

Неразуменьне сваёй віны спараджае стрэсы, комплексы ды няўпэўненасьць, сувязь чаго з узьнікненьнем заіканьня куды больш відавочная.

Такім чынам, паводле прыхільнікаў дзьвюхмоўнага выхаваньня, спрыяльная атмасфэра ў сям'і, пэдагагічны такт і падрыхтаванасьць могуць ня толькі засьцерагчы ад нежаданых наступстваў дзьвюхмоўя, але й прынесьці дзіцяці шмат карысьці. Бо навукова засьведчаныя й перавагі білінгвізму. Лічыцца, што валоданьне й паслугаваньне дзьвюма мовамі спрыяе лепшаму разьвіцьцю памяці ды разумовых здольнасьцяў. Такія дзеткі больш кемлівыя, прасьцей спраўляюцца з матэматычнымі задачкамі, маюць лепшыя аналітычныя здольнасьці, лягчэй думаюць і хутчэй рэагуюць. Яны звычайна лепей вучацца ў школе, прасьцей арыентуюцца ў дарослым жыцьці, а таксама, як нядаўна выявілі дасьледчыкі з усё той жа Англіі, маюць у старасьці больш ураўнаважаны характар ды ясьнейшы розум, менш эгаістычныя і больш аптымістычныя.

Існуюць цэлыя мэтодыкі выхаваньня дзьвюхмоўнага дзіцяці. Некаторыя раяць пачынаць размаўляць з малечай на розных мовах зь першых месяцаў жыцьця або нават да нараджэньня й падмацоўваюць гэта тым, што ўжо агуканьне дзіцяці нібыта мае моўную прыналежнасьць. Іншыя адносяць старт білінвістычнага выхаваньня на 5-гадовы век і фактычна ўяўляюць разнавіднасьць навучаньня замежнай мове з папраўкай на ўзрост. Але ўсе сыходзяцца, што ня варта дапускаць, каб другая мова засвойвалася стыхійна — толькі на вуліцы ды зь сябрамі. Бо і добра не засвоіца, і памылкі выпраўляць будзе складаней. Ёсьць і яшчэ адно, што яднае гэтыя мэтодыкі: што задужа — нездарова. Маленства ў трох- або большмоўным асяродзьдзі — само па сабе стрэс і гарантуе праблемы ў камунікацыйным ды агульным разьвіцьці дзіцяці.

**Андрэй Кузьнечык**

Ангельскія навукоўцы раяць сьпярша навучыць дзіця роднай мове, і толькі пасьля 5-гадовага веку пачынаць вучыць яго мове другой.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Каля 70% жыхароў зямлі дзьвюх- або шматмоўныя.**
Амаль у чвэрці дзяржаваў людзі гавораць сама меней на дзьвюх мовах. Больш за палову жыхароў Эўропы валодаюць дзьвюма мовамі.

**Сёлета пытаньнем уплыву дзьвюхмоўя на чалавека цікавіліся й амэрыканскія навукоўцы.**
Дасьледчыкі з ЗША правялі цікавы экспэрымэнт: Амэрыканкам, якія расьлі ў сем'ях, дзе пароўну карысталіся ангельскай ды гішпанскай мовамі, паказвалі кароткамэтражкі, у якіх жанчыны траплялі ў розныя жыцьцёвыя калізіі. Потым глядачкі давалі характарыстыкі гераіням фільму: пасьля першага прагляду на адной мове, пасьля другога, зь перапынкам у паўгоду, — на другой.

Па-гішпанску глядачкі характарызавалі пэрсанажаў больш станоўча і цёпла, а няпростыя сытуацыі, у якія траплялі гераіні, лішне не драматызавалі. Калі ж пазьней жанчыны пра той самы сюжэт выказваліся на ангельскай, гераіня, дагэтуль называная «сьмелай і незалежнай», раптам аказвалася «разгубленай і адзінокай».

## Загінулі два кіраўнікі Бярозаўскай ДРЭС

23 верасьня намесьнік дырэктара станцыі Васіль Проц, начальнік аддзелу капітальнага будаўніцтва Аляксандар Калоша і начальнік аднаго з цэхаў Сяргей Амельяновіч вярталіся з нарады ў Берасьці. Мужчыны сталі на шашы, каб зайсьці ў кавярню, і калі пераходзілі дарогу, то ўсіх трох зьбіла машына. Проц і Калоша загінулі, а Амельяновіч знаходзіцца ў цяжкім стане ў рэанімацыі.

## «Кастрычніцкая» адчынілася

Яе адкрылі ў пятніцу, але ў суботу і нядзелю яна не працавала. Афіцыйнае прыпыненьне работы тлумачылася тэхнічнымі прычынамі. Хоць злыя языкі казалі, што так было зроблена наўмысна, каб зьменшыць колькасьць людзей, што нядзельным вечарам плянавалі ўзяць удзел у акцыі апазыцыі.

## Малафееў на чале «Дынама»

Праўда, санкт-пецярбурскага. Дамова зь ім была падпісаная ў пятніцу. У 1982 г. Малафееў прывёў менскае «Дынама» да залатых мэдалёў саюзнага першынства. Ад 2001 да 2003 г. ён быў галоўным трэнэрам нацыянальнай зборнай Беларусі.

## Мянчук выйграў мільён

Партал www.pokerstars.com, прысьвечаны гульні ў покер, паведаміў пра завяршэньне чэмпіянату сьвету па онлайн-покеры (WCOOP-2008).

Калі верыць афіцыйнаму паведамленьню, ігрок, зарэгістраваны пад нікам Markush13 і які ўказаў родным горадам Менск, заняў трэцяе месца. Яго выйгрыш склаў 964 909 даляраў і 94 цэнты.

## У Туркменіі зноў парлямэнт

У краіне прынята новая канстытуцыя, якая скасавала найвышэйшы прадстаўнічы і заканадаўчы орган улады халк-маслахаты (народны савет), 2507 чальцоў якога асабіста прызначаліся Туркменбашы. У Туркменіі абвешчаны прынцып шматпартыйнасьці, а ўся заканадаўчая ўлада цяпер належыць парляманту.

## Трокі цяпер курорт

Урад Літвы вырашыў надаць гораду Тракай (Трокі) статус курортнай тэрыторыі. Мяркуецца, што гэта павысіць канкурэнтаздольнасьць гораду ў галіне турызму. Статус курорту ў Літве маюць Біштонас, Друскенікі, Нерынга і Паланга.

Трокі — ня толькі рэзыдэнцыя вялікіх літоўскіх князёў у XIV—XV ст і самы вялікі замак сучаснай Літвы. Незвычайны ландшафт, вялікая колькасьць азёраў і чыстае паветра прыцягваюць у Тракай турыстаў з усяго сьвету.

## Іаан Вісарыёнавіч Ульянаў

У Маскве абвешчаны сьпіс 12 самых уплывовых гістарычных фігур, што вызначыліся ў ходзе інтэрнэт-галасаваньня ў рамках праекту «Імя Расеі». Лідэрам рэйтынгу стаў Аляксандар Неўскі. На другое месца з 12-га перамясьціўся Аляксандар Пушкін, а Іосіф Сталін, наадварот, апынуўся на 12-м, доўгі час ён займаў менавіта другую пазыцыю. У сьпіс таксама ўвайшлі Фёдар Дастаеўскі, Пётр І, Ленін, Сувораў, Кацярына ІІ, Іван Жахлівы, Сталыпін, Аляксандар ІІ, Мендзялееў.

**ЗП, Лявон К, Cz, паводле «Рэспубліка», БЕЛТА, Reuter**




## КАНЦЭРТЫ

**Apple Tea**
**8 кастрычніка ў «Графіці» (зав.Калініна, 16) а 20-й** — канцэрт Apple Tea.

**Зьміцер Вайцюшкевіч**
**10 кастрычніка тамсама а 20-й** — «Восеньскі канцэрт» Зьмітра Вайцюшкевіча.

**«Гарацкія» ў Варшаве**
**Канцэрт будзе 8 кастрычніка а 20-й у клюбе Hydrozagadka (вул.11 лістапада, 22).** Квіткі каштуюць 15 злотых, для студэнтаў — 10.

**Дзецідзяцей**
**5 кастрычніка клюбе «Гудвін» (пр.Незалежнасьці, 19)** — канцэрт гурту «Дзецідзяцей». **Пачатак а 19.00.** Даведкі па т.: (029) 254–49–09.

**Neuro Dubel**
**7 кастрычніка ў «Графіці»** зайграе Neuro Dubel. **Пачатак у 20.00.** Даведкі па т.: (029) 671–58–65, (029) 254–49–09.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Бог футбольнага карнавалу

**Марадона вачыма Кустурыцы**
(Maradona by Kusturica)
Гішпанія — Францыя, 2008, каляровы, 90 хв.

**Рэжысёр:** Эмір Кустурыца

**Жанр:** Дакумэнтальны фільм–партрэт

**Адзнака:** 8 (з 10)

Балканскі рэжысёр Эмір Кустурыца зрабіў кінапартрэт слыннага аргентынскага футбаліста Дыега Марадоны. Кустурыца здаўна зьяўляецца ягоным фанатам…

Але дакумэнтальная стужка Марадоны–Кустурыцы — гэта ня проста партрэт. Гэта няструманы карнавал, які так любіць Кустурыца ў сваіх фільмах. А Дыега Марадона — бог футбольнага карнавалу.

Карнавал — ёсьць гратэск, парушэньне межаў, кульбіты, калі верх і ніз мяняюцца месцамі, а сьлёзы вянчаюцца з рогатам. Зь лёгкай рукі філёзафа Міхаіла Бахціна карнавал ухваляўся як прастора свабоды, што разбурае сур'ёзны афіцыёз.

Карнавал Марадоны — гэта геніяльна–шулерскія галы, трыюмф пакрыўджаных («трэцяга сьвету») над крыўдзіцелямі (злосная каралеўская Англія і Амэрыка), выбуховае лявацтва, антыбушаўскія саколкі, сяброўства зь Фідэлем Кастра і Уга Чавэсам.

Кустурыца дадае свае вынаходкі — танга, вынайдзенае ў бардэлі, і матч Марадоны, сьпевы футбольнае зоркі пра какаін — і ўрыўкі зь фільмаў балканскага мэтра, якія быццам наўмысна здымаліся, каб праілюстраваць жыцьцё Марадоны. «Арыстакратызм беднасьці» — абвяшчае Кустурыца.

У фільме — дэманстрацыі супраць ЗША, кактуэйль Молатава — і Дыега Марадона–мульцяшка, ад якога дастаецца Тэтчэр, Рэйгану, Блэру й Бушу.

Кустурыца п'яны ад лявацкага карнавалу. Ён ня ўзгадвае героеў свайго «Падпольля», якія пераўтварылі лявацка–партызанскае жыцьцё ў пекла, і амаль нічога ня кажа пра камуністаў з чырвоным карнавалам расстрэлаў.

Не заўжды карнавал — свобода. Почасту — гэта бунт і выклік нябёсам. Марадона ў фільме ня проста чалавек — ён бог, стод і зорка. Фанаты стварылі царкву Марадоны, моляцца яму й кляняцца ягоным імем. Маладыя бяруць шлюб пад алтаром Марадоны, нявеста ў фаце ганяе мяч.

Карнавал зьмешвае блюзьнерства і сьвятасьць. Геданіст Кустурыца наблізіўся да блюзьнерства, каб прасьпяваць пра сьвятасьць жыцьця разам зь сябрам Дыегам.

**Андрэй Расінскі**

## ВЫСТАВЫ

**Тацяна Радзівілка і Канстанцін Селіханаў**
Іх выстава працуе **ў менскай мастацкай галерэі «Ла-Сандр-арт».** Гэта адметныя творцы нашага часу. Мастакі — творчая сямейная пара. Намесьнік старшыні Беларускага саюзу мастакоў Рыгор Сітніца сказаў: «Я б вельмі хацеў, каб такі аб'ект, як плястычная кампазыцыя Канстанціна Селіханава «Аркестар» (твор уяўляе сабой калёну, складзеную зь пяці статуяў музыкаў духавога аркестру, якія стаяць адзін на адным. — БелаПАН.) упрыгожваў праспэкт Незалежнасьці каля будынку цырку». Паводле яго меркаваньня, упрыгожваць сталіцу павінны ня толькі «Паштальён з газэтамі» і «Баба Камарыха», якая гандлюе семкамі. **Выстава працуе да 11 кастрычніка.**

**Колер 50-х**
**У фае Менскай гарадзкой цэнтральнай публічнай бібліятэкі імя Я.Купалы (В.Харужай, 16)** Беларускі архіў кінафотадакумэнтаў прэзэнтуе выставу «Колер 50–х», на якой можна ўбачыць афіцыйную фатахроніку 50–х гадоў XX стагодзьдзя.

**Тэхна-арт**
**У мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) да 11 кастрычніка** працуе выстава з сэрыі праекту «Тэхна–арт», на якой прэзэнтуюцца творы Ўладзімера Цэсьлера, Вадзіма Качана, Андрэя Шчукіна і іншых. Кірунак экспазыцыі: 3D–анімацыя, кампутарная графіка, лічбавы мантаж, жывапіс, арт–аб'екты.

**Беларускія мастакі ў Беластоку**
**Да 12 кастрычніка ў беластоцкай галерэі «Арсэнал»** ідзе першарадная выстава твораў беларускіх мастакоў. Яе куратары — Тацяна Бембель, Артур Клінаў і Лена Прэнц — выбралі для паказу творы Вольгі Сазыкінай, Уладзімера Цэсьлера, Сяргея Ждановіча, Аляксея Фёдарава. Ігара Саўчанкі, Яні Грак. Аляксандра Камарова і групы Revision (Андрэя Дурэйкі, Андрэя Камарова, Максіма Тымінкі і Максіма Вакульчыка). Прэзэнтаваныя таксама творы Івана Базака і Аксаны Гурыновіч.

**Вокны Менску. Адлюстраваньне**
**Да 22 кастрычніка ў Мастацкім музэі** працуе выстава фотамастака Георгія Ліхтаровіча «Вокны Менску. Адлюстраваньне».

**Па мясьцінах Адама Міцкевіча**
**У Музэі гісторыі беларускай літаратуры (Багдановіча, 15) да 18 кастрычніка** працуе фотавыстава «Па мясьцінах Адама Міцкевіча».

**Сьвята чытаньня — 2008**
**З 8 да 11 кастрычніка ў Менску і Маладэчне** — Сьвята чытаньня з удзелам пісьменьніцы Ан–Мары Поль.

**«Ждановічы — Wonderland»**
**Да 10 кастрычніка ў фотагалерэі «Zнята» (кінатэатар «Цэнтральны», пр.Незалежнасьці, 13)** працуе фотавыстава Артура Вакарава.

**Беларускі плякат у Варшаве**
**У варшаўскай галерэі «Зоя» (Каперніка, 23)** пачалася выстава сучаснага беларускага плякату. Постэры, прадстаўленыя на выставе, былі створаныя ў пэрыяд з 1985 па 1995 год. На думку арганізатараў, яны даюць магчымасьць пабачыць той нядоўгі час адлігі і дэсавецізацыі і лепш зразумець сёньняшні дзень Беларусі.

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**
**6 (пн)** — «Паўлінка»
**9 (чц), 10 (пт)** — «Ядвіга»
**11 (сб)** — «Маэстра»
**12 (ндз)** — «Каханьне ў стылі барока»
*ранішія спэктаклі*
**12 (ндз)** — «Паўлінка»

# Міжнародны фэстываль тэатраў лялек

У Менску **з 3 да 8 кастрычніка** пройдзе V Беларускі міжнародны фэстываль тэатраў лялек, падчас якога можна будзе ўбачыць больш за 20 спэктакляў з розных краінаў сьвету — Бэльгіі, Вялікай Брытаніі, Нямеччыны, Літвы, Польшчы, Расеі, Славеніі, Украіны, Чэхіі. Свае спэктаклі прапануюць і беларускія тэатры.

**3 кастрычніка**
*На сцэне Тэатру лялек (Энгельса, 20)*
**«Баляда пра белую вішню»** (Беларускі тэатар лялек). **Пачатак а 14-й.**
*На малой сцэне Тэатру юнага гледача (Энгельса, 26)*
**«Мора»** (тэатральная акадэмія, Клайпэда, Літва). **Пачатак а 17-й.**
*На сцэне Рускага тэатру (Валадарскага, 5)*
**«Запаветнае»** (трупа Ірыс Мэйнхарт, Штутгарт, Нямеччына). **Пачатак а 19-й.**
*На сцэне Купалаўскага тэатру (Энгельса, 7)*
**«Фаўст у кубе»** (рускі інжэнэрны тэатар «Ахе», Расея). **Пачатак а 21-й.**

**4 кастрычніка**
*На сцэне Тэатру лялек*
**«Чорная курыца, альбо Падземныя жыхары»** (тэатар «Лялька», Віцебск). **Пачатак а 11-й, 14-й.**
*На малой сцэне Тэатру юнага гледача*
**«Мора»** (тэатральная акадэмія, Клайпэда, Літва). **Пачатак а 17-й.**
*На сцэне Купалаўскага тэатру*
**«Крыжакі»** (тэатар Агара, Сэнт–Віт, Бэльгія). **Пачатак а 19-й.**
*На сцэне Тэатру лялек*
**«Памінальная малітва»** (Гомельскі тэатар лялек). **Пачатак а 21-й.**

**5 кастрычніка**
*На сцэне тэатру лялек*
**«Голы кароль»** (Менскі абласны тэатар лялек «Батлейка»). **Пачатак а 11-й, 14-й.**
*На малой сцэне Тэатру юнага гледача*
**«Самая маленькая жанчына ў сьвеце»** (тэатар Крэпска, Прага, Чэхія). **Пачатак а 17-й.**
*На сцэне Купалаўскага тэатру*
**«Мадэль»** (тэатар Рота, Гастынгс, Ангельшчына). **Пачатак а 19-й.**
*На сцэне Тэатру лялек*
**«Пэр Гюнт»** (Кемераўскі тэатар лялек імя А.Гайдара, Расея). **Пачатак а 21-й.**

**6 кастрычніка**
*На сцэне Тэатру лялек*
**«Осьлік з Назарэту»** (міні тэатар, Любляна, Славенія). **Пачатак а 11-й, 14-й.**
*На малой сцэне Тэатру юнага гледача*
**«Крохкі»** (тэатар Крэпска, Прага, Чэхія). **Пачатак а 17-й.**
*На сцэне Тэатру лялек*
**«Паляваньне на зубра»** (Берасьцейскі тэатар лялек). **Пачатак а 19-й.**

**7 кастрычніка**
*На сцэне Тэатру лялек*
**«Эгле — каралева вужоў»** (тэатар «Леле», Вільня, Літва). **Пачатак а 14-й.**
**«Паэма бяз словаў»** (Гарадзенскі абласны тэатар лялек). **Пачатак а 19-й.**
*На сцэне Купалаўскага тэатру*
**«Волат»** (тэатар «Гулівэр», Варшава, Польшча). **Пачатак а 17-й.**

**8 кастрычніка**
*На сцэне Тэатру лялек*
**«Рамаяна»** (Трупа «Індыйскія лялечнікі», Ад'яр, Індыя). **Пачатак а 11-й, 14-й.**
*На сцэне Купалаўскага тэатру*
**«Кароткі курс беларускай паэзіі»** (Дзяржаўны тэатар лялек, Беласток, Польшча). **Пачатак а 17-й.**

**Квіткі ва ўсіх тэатральных касах Менску.**
**Даведкі: 288-24-19, 288-22-63.**

## ГАЗЭТКА ДЗЕТКАМ

# Люстраванка

Адказ на люстраванку зьмешчаную ў «НН» №35: Мама і дзеткі — Тата і дзеткі.




**Прыдумаў Дзьмітры Дзьмітрыеў**

# Як давесьці дэмакратычнасьць беларускіх выбараў

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Вельмі проста — назіральнікаў АБСЭ трэба цягнуць у буфэты, якія дзейнічаюць пры выбарчых участках. Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

Таварышы, назіральнік АБСЭ, усе сюды. Гэта буфэт, абавязковая частка кожнага выбарчага ўчастку. Паглядзім, якая тут сытуацыя з выбарамі? Як бачым, усё поўнасьцю адпавядае міжнародным стандартам. Татальны ідэйны плюралізм: прэтэндэнты справа — ёгурт і піва, на крайнім левым флянгу — сасіскі, і нарэшце ў цэнтры — чыпсы і мінэралка

Буфэт працуе толькі ў дзень выбараў, і згодна з нашымі законамі катэгарычна забараняецца папярэдняе паяданьне.

Усю інфармацыю выбаршчык можа прачытаць на этыкетках. Акрамя таго, калі вы ўключыце тэлевізар, вы будзеце проста шакаваныя засільлем выбарчай рэклямы.

Выбары і прымус — у Беларусі гэта гучыць як фантастыка. Забараняецца любы ціск на выбаршчыка. Цяжка ўявіць, каб нехта наехаў на выбаршчыка з словамі кшталту: «А ну давай выбірай вось тое пячэньне, пакуль у лыч не атрымаў». Гэта нонсэнс! Пра выбарчую актыўнасьць казаць ня буду: глядзіце самі, колькі выбаршчыкаў у чарзе.

Дарэчы, хацелася ў рэале разьвеяць папулярны міф пра тое, што выбары ў нас адбываюцца па разнарадцы. Быццам працоўных і студэнтаў прымушаюць ісьці і абіраць, пагражаючы ім парваць кантракт ці выкінуць з унівэру. Вось тыя маладыя людзі, напэўна, студэнты. Хлопцы, вы набываеце «Орбіт-ананас» таму, што баіцеся страціць месца ў інтэрнаце? Бачыце рэакцыю. Моладзь сьмяецца з «качак» заходняй прапаганды.

Ідзем далей. Зьвярніце ўвагу, як добра разьвіты ў нашай краіне інстытут незалежных назіральнікаў. Прадстаўнік любой партыі, у тым ліку апазыцыйнай, можа прыйсьці, сесьці за столік і назіраць за выбарчым працэсам. Давайце для прыкладу арганізуем незалежнае назіраньне за тым таўстуном. Глядзіце: ён без ніякіх парушэньняў абірае доктарскую кілбасу.

Нарэшце яшчэ адзін забойны аргумэнт на карысьць тэзісу аб дэмакратычнасьці галасаваньня ў Рэспубліцы Беларусі. Любое сацыялягічнае агенцтва або СМІ можа арганізаваць г.з. экзыт-пол — спытаць людзей на выхадзе з буфэту — што яны абралі на першае, а на дэсэрт?

Як толькі буфэт зачыніцца, прадаўшчыца падвядзе вынікі выбараў. Аднак для вас, шаноўныя назіральнікі, мы падрыхтавалі сюрпрыз. Як вам вядома, у гэтым годзе мы ўвесь час ідзем на сьвядомае парушэньне законаў, каб пераканаць вас у празрыстасьці выяўленьня волі беларусаў. Паспрабуем тайна даведацца, якая ўжо цяпер сытуацыя ў пляне электаральных сымпатый?

Таварыш прадавец, ці не маглі б Вы па сакрэце падзяліцца з намі інфармацыяй — на чыю карысьць цяпер выбар? Кажаце, што больш за ўсё выбаршчык надае перавагу вафлям? Аднак, на Вашу думку, пра канчатковыя вынікі выбараў казаць яшчэ рана. Чаму? Ага. Таму што бліжэй да вечара актывізуецца сацыяльная база кандыдата піва «Крыніца» і магчымыя зьмены. Вось бачыце, спадарства, якая захапляльная інтрыга часам мае месца на беларускіх выбарах.

А наш візыт на гэтым скончаны. Мяркую, што ў вас няма сумневаў накошт высокай ступені дэмакратычнасьці выбарчага працэсу. Бай-бай.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

За граніцаю людзі ніяк ня могуць зразумець, на што ў Расеі заведзены пашпарты, каторыя толькі агранічываюць свабоду расейскіх падданых і затрымоўваюць гандаль; так сама там не разумеюць, чаму ў нас так многа ўсялякіх сьвятаў, як нігдзе на сьвеце, ды ва ўсе сьвяты залішне ўжо часта закрываюцца ўсялякія казённыя прысуцтва, пошты і банкі: вось жа часта праз цэлы тыдзень жыцьцё ў гасударстве як-бы замірае, і ніякіх дзел ня можна рабіць. Ад усяго гэтага народ мае шмат страты, убыткаў.

**«Наша Ніва». №20. 25 верасьня 1908**

## Сусьветны фінансавы крызіс.

**Старонка 5.**



WALL STREET JOURNAL

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**28 верасьня** генэрал-маёру міліцыі, Старшыні Вярхоўнага Савету XII скліканьня, дэпутату Вярхоўнага Савету XIII скліканьня, генэральнаму сакратару Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі Мечыславу Грыбу споўнілася 70 гадоў. Віншуем!

### ШКОЛКА СЬВЯТОЙ ЭЎФРАСІНЬНІ

**Аб'яўляецца набор дзетак** у беларускамоўную нядзельную школку сьв. Эўфрасіньні Полацкай пры грэка-каталіцкім Душпастырскім цэнтры Сьвятога Язэпа ў Менску. Прымаюцца дзеці ад 4 да 15 гадоў. Заняткі будуць праходзіць у памяшканьні Цэнтру па вул. Арджанікідзэ, 6. Запісацца можна праз тэлефоны: Айцец Яўген Усошын (029) 312-28-26; jusoszyn@tut.by, сястра Вікторыя Чэкан (029) 309-86-02; s.viktoryja@gmail.com

### КУРСЫ НАРОДНАЙ ВЫШЫЎКІ

**Запрашаем** на курсы беларускай народнай вышыўкі. Заняткі з 1 кастрычніка ў памяшканьні БНТУ (ранішняя і вячэрняя групы). Т.: (029) 171-13-90 (Галіна)

### КНІГІ

**Прапаную кнігі**: «Беларускі кнігазбор» каля 20 кніг, часопісы «Спадчына», «Наша Ніва» 1906—1908, 1910 г., Ластоўскі, «Наша Доля» 1906, Энцыкляпэдыя Гісторыі Беларусі 1—5 т., кнігі па этнаграфіі, гісторыі, архітэктуры, мастацкія ды іншае, багаты выбар. Т.: (029) 753-70-05

**Прапануем**: «Незалежная прэса»: Быкаў, Барадулін, Бураўкін, Арлоў, Кіпель, Конан, Гарэцкі, Разанаў, Брыль і інш. «Гоман»: розныя выпускі, сотні аўтараў, у т.л. тэксты на тарашкевіцы, літаратурная вучоба. Дапаможам падрыхтаваць тэксты розных жанраў, пераклад, віншавальныя вершы, рэдактура, выданьні. Т.: (029) 753-91-96, alesknigi@mail.ru

**Прадаю калекцыю** дыскаў зь беларускай музыкай, а таксама калекцыю аўдыёкніжак. Т.: (029) 615-47-76

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101-03-24. Юрась.

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

## Дзякуй

**Міхаілу Т.** з Слуцкага раёну.
**Мікалаю К.** з Валожынскага раёну.
**Аляксандру П.** з Глыбоцкага раёну.
**Ірыне Ш.** з Браслаўскага раёну.
**Паўлу С.** з Горацкага раёну.
**Алене С., А.Дз., В.П.** з Магілёва.
**Антону Б., Галіне Ю.** зь Верхнядзьвінскага раёну.
**Сяргею Х.** з Столінскага раёну.
**Георгію С.** з Воршы.
**Леаніду Я.** з Пухавіцкага раёну.
**Анатолю С.** з Мазырскага раёну.
**П.Б., Вадзіму К.** зь Берасьця.

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 01.10.2008.

Замова №    .

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.